Комуністычная партыя (большэвікаў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 228 (5061)
КАСТРЫЧНІКА
11
ЧАЦВЕР
1934 г.
год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

АБ СКАРЫСТАННІ ХЛЕБА, АДПУШЧАНАГА НА СТЫМУЛЯВАННЕ ІЛЬНОПЕНЬКАЗАГАТОВАК ПА ПРАМОМУ ПРЫЗНАЧЭННЮ

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

У сувязі з тым, што хлеб, выданы Заготільном (райзагамі) калгасам пад кантрактацыю ільну і канапель вясной гэтага года ў значнай частцы калгасаў скарыстан для гаспадарчых мэт (на насенне, дзіцячым яслям, асобным калгаснікам і т. д.), Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць усе калгасы, якія атрымалі хлеб пад кантрактацыю і скарысталі яго не па прамому прызначэнню, у дакадны тэрмін выдзеліць такую колькасць хлеба з агульнага калгаснага фонда і размеркаваць паміж калгаснікамі, сапраўды працаваўшымі па сяўбе, уборцы, апрацоўцы і здачы ільнопенькапрадукцыі, у адпаведнасці з затрачанай колькасцю працадзён па апрацоўцы ільну і канапель.

2. СНК папярэджвае РВК, сельсоветы і старшынь калгасаў, што ўвесь хлеб, алей, рыба і цукар і не менш 80 процантаў промтавараў, атрымліваемых за здачу ільнопенькапрадукцыі павінны быць размеркаваны па працаднях толькі паміж тымі калгаснікамі, якія працуюць па ільну і канаплях.

Нам. старшыні СНК БССР
А. СААК'ЯН.
Кіраўнік спраў СНК БССР
С. ШАБАЛТАС.

АБ СТАНОВІШЧЫ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ У КІНЕШЭМСКАЙ ГАРАДСКОЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Пастанова ЦК ВКП(б)

Заслухаўшы паведамленне аб становішчы партыйнай работы ў Кінешэмскай гарадской партыйнай арганізацыі, ЦК ВКП(б) устанаўляе крайнюю слабасць унутрыпартыйнай і палітычна-масавай работы партарганізацыі і няўважлівыя адносіны да культурна-бытавых патрэб і запросаў рабочых.

Гэту сваю блядзейнасць кіраўніцтва працоўе апраўдаць спасыланнямі на першачарговасць такіх работ, як хлебазакупка, капанне бульбы і інш., г. зн. стварацца самая адкрытая антыпартыйная чарговасць. Усё гэта магло здарыцца толькі ў разультаце поўнай самасупакоенасці і прямой недаацэнкі значэння ільнозагатовак у раёнах.

ЦК і СНК адзначаюць, што:

1

Найбольш неарганізавана і безадказна справа прарічнай апрацоўкі і ільнозагатовак пастаўлена ў раёнах Бялыніцкім, які выканаў на 5-Х—2,4 проц., Ушацкім—7 проц., Лепельскім—8,2 проц., Крупскім — 7,1 проц. ЦК і СНК абвяшчаюць вымоў сакратару Бялыніцкага РК т. РЫМША і старшыні РВК тав. СУКАЛА, сакратару Ушацкага РК т. ТАРАСЕВІЧУ і старшыні РВК т. ЛУЧЫНА, сакратару Лепельскага РК т. ХІЖЫНКОВУ, сакратару Крупскага РК т. МІСНІКЕВІЧУ і старшыні РВК т. СКАРАХОДУ і папярэджваюць іх, што калі наступная пяцідзённка не дасць рашучага пералому ў ільнозагатоўках, да іх будуць прыменены больш суровыя меры пакарання аж да зняцця з работы.

2

Папярэдзіць сакратара Дубровенскага РК т. МЫШАЛОВА і старшыню РВК т. МАЦКО, сакратара Талачынскага РК т. ТУРЫКА і старшыню РВК т. ФЕДАРЭНЧЫКА, сакратара Гарадоцкага РК т. КАНАВАЛАВА і старшыню РВК тав. СУРБА, сакратара Чашніцкага РК т. МАРГОЛІНА і старшыню РВК т. ТРЫЗНА і сакратара Расонскага РК т. ЧУМАКОВА і старшыню РВК т. ПАРТНОВА, што далейшае адставанне іх у справе ільнозагатовак пацягне за сабой найстражэйшае партыйнае пакаранне.

3

Лічыць зусім недапушчальным адставанне ў ільнозагатоўках такіх перадавых раёнаў, як Барысаўскі, Менскі, Слуцкі, Хойніцкі і інш. ЦК і СНК звяртаюць увагу партыйнага і совецкага кіраўніцтва гэтых раёнаў, а таксама і другіх (Гомель), якія лічаць сябе ільнаводчымі і плятуцца ў хвосце па загатоўках, што такія адносіны да справы ільнозагатовак ЦК і СНК могуць разглядаць, як прямую недаацэнку справы ільну з іх боку і патрабуюць неадкладнага выпраўлення работы, забяспечыўшы хуткае выкананне плана.

4

Абавязаць РК, РВК, нач. паліт-аддзелаў МТС:

а) узяць у свае рукі арганізацыю работы ільномяльных пунктаў у калгасах і перапрацоўкі і здачы ільну адпаасобным сектарам;

б) не на словах, а на справе пераключыць для ручной апрацоўкі ільну не менш 50 проц. рабочай сілы ў калгасах, выкарыстаць поўнасцю ўсю наяўнасць ільнапрацоўчых машын;

в) паўсямесна наладзіць работу дзесяцідворнікаў сярод адпаасобнікаў, абавязаўшы старшынь сельсоветаў штодзённым кіраўніцтвам работай гэтых дзесяцідворнікаў;

г) прымацаваць раённы актыў да ільномяльных пунктаў адстаючых калгасаў з вялікім планавым заданнем.

5

У адстаючых раёнах—Лепельскім, Ушацкім, Гарадоцкім, Чашніцкім, Крупскім, Дуброўенскім, Бялыніцкім і Расонскім—ЦК і СНК усклядаюць персанальную адказнасць за арганізацыю работы на ільномяльных пунктах у калгасах МТС—на дырэктароў МТС, а ў калгасах на МТС—на старшынь РВК. Даручыць НКЗ сістэматычны нагляд за іх работай з неадкладнай пастаноўкай у ЦК і СНК пытання аб неспраўляючыхся. Адклікаць з водпуска старшыню Лепельскага РВК т. ЗАКОРКІНА. Затрымаць водпуск старшыні Расонскага РВК т. ПАРТНОВА.

6

Катэгарычна забараніць выкарыстанне хлеба і масла, прызначаных для персанальнага атаварэння здатчыкаў ільну на якія-б там ні было іншыя мэты. Белзагатільну неадкладна праверыць хаванне гэтых прадуктаў на раённых складах загатоўшчыкаў, а таксама парадак іх выкарыстоўвання, прыцягваючы да найстражэйшай адказнасці за разбазэраванне, незаконныя выдачы або затрымку выдачы хлеба і масла ільназдатчыкам.

7

ЦК і СНК указваюць дырэктару ільнотрэста т. ТАРАСАВУ, што яго няправільныя дырэктывы, даныя заводам аб перадку прыёмкі трасты, прывялі на радзе заводаў да прамых скрыўленняў у адносінах здатчыкаў ільнотрасты і затармазілі загатоўку, і прапануюць яму неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі, забяспечыўшы нармальную работу па прыёмцы трасты ўстаноўленай нумарнасці.

Абавязаць т. Тарасава не пазней 12 кастрычніка закончыць рамонт застаўшыхся ільнозаводаў і пуску іх у эксплаатацыю.

8

ЦК і СНК абавязваюць Белзагатолён устанавіць сістэматычны нагляд і кантроль за работай заготпунктаў, праверку сапраўднага ведання справы і добрасумленнасці з боку работнікаў пунктаў у адносінах здатчыка і абслугоўвання здатчыка на пункце.

9

Лічыць зусім недастатковай работу прарічных партыйных арганізацый і парторгаў у справе арганізацыі апрацоўкі і здачы ільну, асабліва сярод аднаасобнікаў.

ЦК і СНК абавязваюць вакол пытанняў прарічнай апрацоўкі і загатоўкі ільнапенькі разгарнуць такія-ж метады масавай работы, якія прымяняліся па хлебапастаўках (эператыўнасць, справаздачнасць, пасылка актыва ў дапамогу адстаючым, растлумачальная масавая работа і т. д.).

У асаблівасці неабходна арганізаваць соцспаборніцтва паміж калгасамі і сельсоветамі за хутчэйшую і добраякасную работу ільномяльных пунктаў і ўдарніцтва паміж групамі і асобнымі калгаснікамі і калгаснікамі, занятым на ільне.

10

ЦК і СНК ставяць на від нам. загадчыка Белсельгасснабам т. УРБАНОВІЧУ за тое, што ў радзе раёнаў усё яшчэ на складах астаюцца незабранымі калгасамі ільноўборачныя машыны і за зусім недапушчальнае з яго боку кіраўніцтва справай адгрузкі ў раён частак ільнотрапальнай машыны Гарпачова.

Абавязаць т. Урбановіча ў пяцідзённы тэрмін разм[illegible]каваць усе машыны па калгасах і забяспечыць адпраўку астаўшыхся на заводах частак ільнотрапалкі Гарпачова па раёнах.

11

ЦК і СНК лічаць зусім нездавальняючым кіраўніцтва справай прарічнай апрацоўкі ільну з боку Ільноўпраўлення НКЗ і ўказваюць НКЗ на надзвычай слабую арганізатарскую ролю ў работах па ільну раённых зямельных упраўленняў і недастаткова аператыўнае кіраўніцтва райэа з боку НКЗ.

Абавязаць НКЗ умацаваць работу Ільноўпраўлення, ператварыўшы яго ў аператыўны балвы орган НКЗ, моцна звязаны з месцамі, які давяў-бы сістэматычна накіроўваць і кантраляваць справу ільну ў раёне і калгасе.

У прыватнасці абавязаць Ільноўпраўленне ў пяцідзённы тэрмін: а) забяспечыць разварот работ усіх ільномяльных пунктаў у раёнах, якія ўваходзяць у зону дзейнасці ўпраўлення, і даць на старонках цэнтральнага друку паказ работы лепшых ільномяльных пунктаў;

б) дабіцца неадкладнага завозу газы і лампы «Летучая мышь» у пункты апрацоўкі ільну;

в) прасачыць за ходам зборкі ў раёнах ільнотрапалак Гарпачова і хутчэйшага ўводу іх у эксплаатацыю;

г) Наркамзему неабходна ўзмацніць адказнасць загадчыкаў райэа і дырэктароў МТС у пытаннях аб ільне. У прыватнасці, праверыць работу загадчыкаў райэа і дырэктароў МТС адстаючых ільнаводчых раёнаў з пастаноўкай у ЦК і СНК пытання аб неспраўляючыхся.

12

ЦК і СНК папярэджваюць т. Баскіна, што далейшая бяздзейнасць сістэмы Белкаапсаюза ў справе загатоўкі ільну нецярпіма. Абавязаць т. Баскіна праверыць рад райсаюзаў з пункту гледжання іх кіраўніцтва загатоўкамі ільну, камандзіраваўшы з гэтай мэтай адказных работнікаў Белкаапсаюза на месцы.

13

Камандзіраваць у раёны: Лепельскі, Чашніцкі, Ушацкі — т. Бенека; Расонскі, Сіроцінскі, Полацкі—тав. Чарвякова; Гарадоцкі, Суражскі — т. Картукова; Крупскі, Талачынскі, Дубровенскі—т. Коніка; Бялыніцкі, Шклоўскі, Магілеўскі — т. Красоўскага; Горацкі, Мсціслаўскі—т. Кавальчука; Клічаўскі, Быхаўскі—тав. Горына—для праверкі работы па ільну гэтых раёнаў і дапамогі ў арганізацыі справы хутчэйшага завяршэння плана ільнопеньказагатовак.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Нам. старшыні СНК БССР
САК'ЯН.

АБ ХОДЗЕ ІЛЬНОПЕНЬКАЗАГАТОВАК

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б і СНК БССР

Не гледзячы на рад сур'ёзных папярэджанняў з боку ЦК і СНК усім райпартарганізацыям, і асабліва асобным РК, як Расонскі, Ушацкі, Чашніцкі, Гарадоцкі, Быхаўскі і інш. аб недастатковых тэмпах ільнозагатовак і неабходнасці пабольшэвіцку арганізаваць справу прарічнай апрацоўкі і загатоўкі ільну, да гэтага часу прыкметнага ўздыму няма. Горш таго, разультаты двух апошніх пяцідзёвак (прырост 5,6 проц.) з усёй відавочнасцю паказваюць, што ў справе ільнозагатовак стварыўся самы недапушчальны самацёк у разультаце бяздзейнасці мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый.

Гэту сваю бяздзейнасць кіраўніцтва працоўе апраўдаць спасыланнямі на першачарговасць такіх работ, як хлебазакупка, капанне бульбы і інш., г. зн. стварацца самая адкрытая антыпартыйная чарговасць. Усё гэта магло здарыцца толькі ў разультаце поўнай самасупакоенасці і прямой недаацэнкі значэння ільнозагатовак у раёнах.

ЦК і СНК адзначаюць, што:

1

Найбольш неарганізавана і безадказна справа прарічнай апрацоўкі і ільнозагатовак пастаўлена ў раёнах Бялыніцкім, які выканаў на 5-Х—2,4 проц., Ушацкім—7 проц., Лепельскім—8,2 проц., Крупскім — 7,1 проц. ЦК і СНК абвяшчаюць вымоў сакратару Бялыніцкага РК т. РЫМША і старшыні РВК тав. СУКАЛА, сакратару Ушацкага РК т. ТАРАСЕВІЧУ і старшыні РВК т. ЛУЧЫНА, сакратару Лепельскага РК т. ХІЖЫНКОВУ, сакратару Крупскага РК т. МІСНІКЕВІЧУ і старшыні РВК т. СКАРАХОДУ і папярэджваюць іх, што калі наступная пяцідзённка не дасць рашучага пералому ў ільнозагатоўках, да іх будуць прыменены больш суровыя меры пакарання аж да зняцця з работы.

2

Папярэдзіць сакратара Дубровенскага РК т. МЫШАЛОВА і старшыню РВК т. МАЦКО, сакратара Талачынскага РК т. ТУРЫКА і старшыню РВК т. ФЕДАРЭНЧЫКА, сакратара Гарадоцкага РК т. КАНАВАЛАВА і старшыню РВК тав. СУРБА, сакратара Чашніцкага РК т. МАРГОЛІНА і старшыню РВК т. ТРЫЗНА і сакратара Расонскага РК т. ЧУМАКОВА і старшыню РВК т. ПАРТНОВА, што далейшае адставанне іх у справе ільнозагатовак пацягне за сабой найстражэйшае партыйнае пакаранне.

3

Лічыць зусім недапушчальным адставанне ў ільнозагатоўках такіх перадавых раёнаў, як Барысаўскі, Менскі, Слуцкі, Хойніцкі і інш. ЦК і СНК звяртаюць увагу партыйнага і совецкага кіраўніцтва гэтых раёнаў, а таксама і другіх (Гомель), якія лічаць сябе ільнаводчымі і плятуцца ў хвосце па загатоўках, што такія адносіны да справы ільнозагатовак ЦК і СНК могуць разглядаць, як прямую недаацэнку справы ільну з іх боку і патрабуюць неадкладнага выпраўлення работы, забяспечыўшы хуткае выкананне плана.

4

Абавязаць РК, РВК, нач. паліт-аддзелаў МТС:

а) узяць у свае рукі арганізацыю работы ільномяльных пунктаў у калгасах і перапрацоўкі і здачы ільну адпаасобным сектарам;

б) не на словах, а на справе пераключыць для ручной апрацоўкі ільну не менш 50 проц. рабочай сілы ў калгасах, выкарыстаць поўнасцю ўсю наяўнасць ільнапрацоўчых машын;

в) паўсямесна наладзіць работу дзесяцідворнікаў сярод аднаасобнікаў, абавязаўшы старшынь сельсоветаў штодзённым кіраўніцтвам работай гэтых дзесяцідворнікаў;

г) прымацаваць раённы актыў да ільномяльных пунктаў адстаючых калгасаў з вялікім планавым заданнем.

5

У адстаючых раёнах—Лепельскім, Ушацкім, Гарадоцкім, Чашніцкім, Крупскім, Дуброўенскім, Бялыніцкім і Расонскім—ЦК і СНК усклядаюць персанальную адказнасць за арганізацыю работы на ільномяльных пунктах у калгасах МТС—на дырэктароў МТС, а ў калгасах на МТС—на старшынь РВК. Даручыць НКЗ сістэматычны нагляд за іх работай з неадкладнай пастаноўкай у ЦК і СНК пытання аб неспраўляючыхся. Адклікаць з водпуска старшыню Лепельскага РВК т. ЗАКОРКІНА. Затрымаць водпуск старшыні Расонскага РВК т. ПАРТНОВА.

6

Катэгарычна забараніць выкарыстанне хлеба і масла, прызначаных для персанальнага атаварэння здатчыкаў ільну на якія-б там ні было іншыя мэты. Белзагатільну неадкладна праверыць хаванне гэтых прадуктаў на раённых складах загатоўшчыкаў, а таксама парадак іх выкарыстоўвання, прыцягваючы да найстражэйшай адказнасці за разбазэраванне, незаконныя выдачы або затрымку выдачы хлеба і масла ільназдатчыкам.

7

ЦК і СНК указваюць дырэктару ільнотрэста т. ТАРАСАВУ, што яго няправільныя дырэктывы, даныя заводам аб перадку прыёмкі трасты, прывялі на радзе заводаў да прамых скрыўленняў у адносінах здатчыкаў ільнотрасты і затармазілі загатоўку, і прапануюць яму неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі, забяспечыўшы нармальную работу па прыёмцы трасты ўстаноўленай нумарнасці.

Абавязаць т. Тарасава не пазней 12 кастрычніка закончыць рамонт застаўшыхся ільнозаводаў і пуску іх у эксплаатацыю.

8

ЦК і СНК абавязваюць Белзагатолён устанавіць сістэматычны нагляд і кантроль за работай заготпунктаў, праверку сапраўднага ведання справы і добрасумленнасці з боку работнікаў пунктаў у адносінах здатчыка і абслугоўвання здатчыка на пункце.

9

Лічыць зусім недастатковай работу прарічных партыйных арганізацый і парторгаў у справе арганізацыі апрацоўкі і здачы ільну, асабліва сярод аднаасобнікаў.

ЦК і СНК абавязваюць вакол пытанняў прарічнай апрацоўкі і загатоўкі ільнапенькі разгарнуць такія-ж метады масавай работы, якія прымяняліся па хлебапастаўках (эператыўнасць, справаздачнасць, пасылка актыва ў дапамогу адстаючым, растлумачальная масавая работа і т. д.).

У асаблівасці неабходна арганізаваць соцспаборніцтва паміж калгасамі і сельсоветамі за хутчэйшую і добраякасную работу ільномяльных пунктаў і ўдарніцтва паміж групамі і асобнымі калгаснікамі і калгаснікамі, занятым на ільне.

10

ЦК і СНК ставяць на від нам. загадчыка Белсельгасснабам т. УРБАНОВІЧУ за тое, што ў радзе раёнаў усё яшчэ на складах астаюцца незабранымі калгасамі ільноўборачныя машыны і за зусім недапушчальнае з яго боку кіраўніцтва справай адгрузкі ў раён частак ільнотрапальнай машыны Гарпачова.

Абавязаць т. Урбановіча ў пяцідзённы тэрмін разм[illegible]каваць усе машыны па калгасах і забяспечыць адпраўку астаўшыхся на заводах частак ільнотрапалкі Гарпачова па раёнах.

11

ЦК і СНК лічаць зусім нездавальняючым кіраўніцтва справай прарічнай апрацоўкі ільну з боку Ільноўпраўлення НКЗ і ўказваюць НКЗ на надзвычай слабую арганізатарскую ролю ў работах па ільну раённых зямельных упраўленняў і недастаткова аператыўнае кіраўніцтва райэа з боку НКЗ.

Абавязаць НКЗ умацаваць работу Ільноўпраўлення, ператварыўшы яго ў аператыўны балвы орган НКЗ, моцна звязаны з месцамі, які давяў-бы сістэматычна накіроўваць і кантраляваць справу ільну ў раёне і калгасе.

У прыватнасці абавязаць Ільноўпраўленне ў пяцідзённы тэрмін: а) забяспечыць разварот работ усіх ільномяльных пунктаў у раёнах, якія ўваходзяць у зону дзейнасці ўпраўлення, і даць на старонках цэнтральнага друку паказ работы лепшых ільномяльных пунктаў;

б) дабіцца неадкладнага завозу газы і лампы «Летучая мышь» у пункты апрацоўкі ільну;

в) прасачыць за ходам зборкі ў раёнах ільнотрапалак Гарпачова і хутчэйшага ўводу іх у эксплаатацыю;

г) Наркамзему неабходна ўзмацніць адказнасць загадчыкаў райэа і дырэктароў МТС у пытаннях аб ільне. У прыватнасці, праверыць работу загадчыкаў райэа і дырэктароў МТС адстаючых ільнаводчых раёнаў з пастаноўкай у ЦК і СНК пытання аб неспраўляючыхся.

12

ЦК і СНК папярэджваюць т. Баскіна, што далейшая бяздзейнасць сістэмы Белкаапсаюза ў справе загатоўкі ільну нецярпіма. Абавязаць т. Баскіна праверыць рад райсаюзаў з пункту гледжання іх кіраўніцтва загатоўкамі ільну, камандзіраваўшы з гэтай мэтай адказных работнікаў Белкаапсаюза на месцы.

13

Камандзіраваць у раёны: Лепельскі, Чашніцкі, Ушацкі — т. Бенека; Расонскі, Сіроцінскі, Полацкі—тав. Чарвякова; Гарадоцкі, Суражскі — т. Картукова; Крупскі, Талачынскі, Дубровенскі—т. Коніка; Бялыніцкі, Шклоўскі, Магілеўскі — т. Красоўскага; Горацкі, Мсціслаўскі—т. Кавальчука; Клічаўскі, Быхаўскі—тав. Горына—для праверкі работы па ільну гэтых раёнаў і дапамогі ў арганізацыі справы хутчэйшага завяршэння плана ільнопеньказагатовак.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Нам. старшыні СНК БССР
САК'ЯН.

АБМЕН НОТАМІ ПАМІЖ МІНІСТРАМ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ЯПОНІІ п. ХІРОТА І ПАУПРЭДАМ СССР У ТОКІО тав. К. К. ЮРЭНЕВЫМ

4 верасня японскі міністр замежных спраў п. Хірота паслаў паўнамоцнаму прадстаўніку СССР у Японіі т. К. К. Юрэневу наступную ноту, якая з'яўляецца адказам на ноту т. Юрэнева ад 22 жніўня г. г. па поваду арышту совецкіх грамадзян служачых КУЧ:

«Пан пасол, маю гонар пацвердзіць атрыманне ноты вашага прэвасхадзіцельства, датаванай 22 жніўня, адносна арышту некаторых служачых Паўночна-Манчжурскай чыгункі, меўшых месца 13, 14, а таксама 16 жніўня на Усходняй лініі гэтай дарогі.

У адказ паведамляю, што ўказаныя арышты праведзены Манчжоу-Го проста для ажыццяўлення сваёй юрысдыкцыі, у сувязі са змовамі, маючымі на мэце пускаць пад адкос вайсковыя паязды, што, як добра вядома совецкаму ўраду, часта мела месца на Усходняй лініі на працягу апошніх некалькіх месяцаў. Далей, японскае ваеннае міністэрства ніколі не апублікоўвала такіх афіцыяльных заяў адносна ўказаных змоў, якія ўпамяну ты ў ноце вашага прэвасхадзіцельства.

Наўрад ці павінен я дабавіць, што японскі ўрад не павінен ніякім чынам лічыцца адказным за якія-б там не было новасці і паведамленні, якія з'яўляюцца ў японскім друку.

З совецкага боку вышэйуказаныя здарэнні з паязнямі прыпісваюцца дзеянням звычайных банды таў і, больш таго, некаторыя ідуць так далёка, што сцвярджаюць, што гэтыя здарэнні трэба прыпісаць намеранай нябайнасці або дзеянню з боку Японіі і Манчжоу-Го. Аднак, з-за якіх магчымых прычын павінны былі-б дзве краіны, якія нясуць сумесную адказнасць за абарону Манчжоу-Го, прабаваць пускаць пад адкос вайсковыя паязды? З другога боку, калі бандыты нападалі на паязды, то яны нават не прабавалі аграбіць вагоны, што пацвярджае сцвярджэнне, што гэтыя напады не павінны разглядацца ў такім-жа святле, як дзеянні звычайных бандытаў.

Нядаўняе павелічэнне колькасці паведамленняў японскага друку аб здарэннях на Усходняй лініі Паўночна-Манчжурскай чыгункі паказвае — калі наогул яны сведчаць аб чым-небудзь—вялікую цікавасць, якую падобныя здарэнні выклікаюць у японскага народу. Сцвярджэнне совецкага ўрада, што падобныя паведамленні газет і ўказаныя арышты «сведчаць аб інтэнсіфікацыі апрасіўных спроб з боку некаторых японскіх афіцыяльных колаў», з'яўляецца яўным скажэннем факта, як гэта ясна і зразумела з вышэйпрыведзенага заўважэння.

У сувязі з гэтым жадаю звярнуць пільную ўвагу совецкага ўрада на той факт, што безапэляцыйныя выказванні відных асоб СССР, надрукаваныя супроць Японіі, таксама як і апублікаванне органамі совецкага ўрада і кампартыі артыкулаў і перадавых прадвакацыйнага характару адносна Японіі, стаўшыя частымі з'явамі за апошні час, яўна разыходзяцца з аб'яўленай совецкім урадам палітыкай міру і перашкаджаюць нармальнаму развіццю совецка-японскіх адносін.

Совецкі ўрад павінен быць добра інфармаваным аб тым факце, што ў сувязі са здарэннямі з паязнямі і падобнага роду парушэннямі міру і парадку ў Паўночнай Манчжурыі, час ад часу многа совецкіх грамадзян было арыштавана з вясны сёлетняга года. Усё-ж ён выдзяляе асобныя прыклады самых апошніх арыштаў, яўна дапускаючы, што гэтыя арышты маюць нешта супольнае з перарывам перагавораў аб продажу Паўночна-Манчжурскай дарогі, што яны выклікалі «дэзарганізацыю дзейнасці дарогі» і з'яўляюцца «грубым парушэннем дагаворных праў СССР». Падобны погляд на становішча, прыняты совецкім урадам, пазбаўляе усякай падставы і з'яўляецца грубейшым скажэннем фактаў. Калі нават перагаворы аб продажу дарогі не пацярпелі-б затрымкі, то зварот да ўказаных судовых мер павінен быў быць катэгарычна неабходным з мэтай забеспячэння нармальнай дзейнасці дарогі і падтрымання міру і парадку ўздоўж лініі. Такоўкі справа абстаіць так, японскі ўрад затрудняецца зразумець сапраўдны матыў совецкага ўрада пры высоўванні ўсіх выпадамянёных дапушчэнняў і сцвярджэнняў. Японскі ўрад сур'ёзна заключае тым, з якіх колаў кіруюцца вышэйпамянёныя змовы. Трэба адзначыць у сувязі з гэтым, што ва ўсіх здарэннях з паязнямі, аб якіх ідзе гутарка, напады адбываліся толькі на Усходняй лініі Паўночна-Манчжурскай чыгункі.

Большасць паязнёў, якія падвергаліся нападзенню, былі паязды, перавозящыя ваенныя матэрыялы, пры чым не было спробы аграбіць гэтыя паязды, і ахвярамі ідэнтыфікаваў у большасці выпадкаў былі японцы або манчжуры, у той час як совецкія грамадзяне рэдка страдалі. Гэтыя з'явы цалкам адрозніваюцца ад звычайных нападаў на паязды. Згодна маючайся на руках інфармацыі, амаль усе нядаўна арыштаваныя служачыя на Усходняй лініі належаць да нейкіх нелегальных таварыстваў, якія імкнуцца да парушэння міру і парадку ў Манчжоу-Го. Апрача таго, некаторыя служачыя дарогі давалі дырэктывы бандытам аб разбурэнні дарогі і спабжалі іх выбуховымі матэрыямі і т. д. Здаецца натуральным у святле гэтых і іншых фактаў, а таксама акалічнасцей, што некаторыя совецкія падданыя павінны лічыцца, у тым або іншым парадку, звязанымі са змовамі, аб якіх ідзе гутарка.

Карыстаюся выпадкам засведчыць Вам, г. пасол, запэўненні маёй высокай к Вам пашаны.

ХІРОТА».

* * *

У адказ на гэту ноту тав. Юрэневым 5 кастрычніка 1934 г. уручана г. Хірота наступная нота:

«Пан міністр,

нотай ад 22 жніўня я, па даручэнню ўрада СССР, заявіў пратэст супроць незаконных і бесперыпынных арыштаў совецкіх грамадзян — служачых на Усходняй лініі КУЧ і супроць прад'яўлення арыштаваным неабгрунтаваных і проста недарэчных абвінавачанняў, пры чым вымушан быў характарызаваць гэтыя дзеянні япона-манчжурскіх улад як унясенне дезарганізацыі ў работу дарогі, як грубае парушэнне дагаворных прав СССР на КУЧ і як паказчык абвастрэння агрэсіўных намераў некаторых афіцыяльных японскіх колаў.

4 верасня я атрымаў ад Вас адказную ноту, па зместу якой я маю гонар заявіць наступнае:

1. У адказ на мой пратэст вы заяўляеце, што арыштаваныя служачыя Усходняй лініі КУЧ з'яўляюцца ўдзельнікамі «змоў, маючых мэтай пускаць пад адкос японскія вайсковыя паязды, што, як добра вядома совецкаму ўраду, часта мела месца на Усходняй лініі на працягу апошніх некалькіх месяцаў». Пры гэтым у пацвярджэнне віноўнасці арыштаваных совецкіх грамадзян Вы спасылаецеся на тую акалічнасць, што пры нападах на паязды, ахвярамі «ў большасці выпадкаў былі японцы або манчжуры, у той час як совецкія грамадзяне рэдка страдалі».

У сувязі з гэтымі сцвярджэннямі, я дазволю сабе спасылацца на наступныя афіцыяльна ўстаноўленыя даныя.

За час з 1 студзеня па 5 верасня 1934 года на Усходняй лініі КУЧ адбылося 22 крушэнні паязнёў, пры чым з гэтых 22-х паязнёў толькі адзін пацярпеўшы крушэнне 17 чэрвеня прадстаўляў з сябе вайсковы састаў. Усяго-ж за ўказаныя 8 месяцаў па Усходняй лініі прайшло 60 вайсковых составаў. Праўда, японскія вайсковыя грузы накіроўваліся таксама і ў зборных таварных паязнёх. Усяго, згодна заявак японскага ваеннага камандавання, паступіўшых у Упраўленне КУЧ, было перавезена за час з 1 студзеня па 1 верасня 1934 г., уключаючы памянёныя вайсковыя паязды 6949 вагонаў з японскімі вайсковымі грузамі і людзьмі. Судзячы па пісьмовому заяўленню японскага ваеннага камандавання ад 9 жніўня на імя ўпраўляючага КУЧ **Рудага**, з гэтай колькасці ўсяго пашкоджана і загінула 47 вагонаў, а па афіцыяльных актах КУЧ, складзеных пры крушэннях, пашкоджана і загінула толькі 26 вагонаў.

Калі прыняць пад увагу гэтыя даныя, то стане ясна, што не адпавядае сапраўднасці першае і асноўнае сцвярджэнне, якое змяшчаецца ў ноце ад 4 верасня, аб частых выпадках пуску пад адкос японскіх вайсковых паязнёў.

Такім-жа чынам абстаіць справа і з другім сцвярджэннем, аб тым, быццам пры крушэннях паязнёў на Усходняй лініі страдалі галоўным чынам японцы і манчжуры і толькі вельмі рэдка—совецкія грамадзяне.

Згодна тых-жа афіцыяльных даных, у часе 22 меўшых месца за апошнія 8 месяцаў на Усходняй лініі КУЧ крушэнняў, а таксама пры нападзенні хунхузаў на чыгуначныя станцыі Усходняй лініі, усяго былі ранены 2 японскіх салдаты, а з ліку совецкіх грамадзян—служачых КУЧ было забіта 9, ранена 171, уведзена хунхузамі ў палон 43 і аграблена 13.

Такім чынам, афіцыяльныя даныя поўнасцю абвяргаюць сцвярджэнні японскага боку і тым самым пацвярджаюць бесперыпынасць і незаконнасць арыштаў грамадзян СССР.

2. Апублікаваныя ў розныя часы афіцыяльныя дакументы КУЧ і, у прыватнасці, заяўленне намесніка старшыні праўлення КУЧ тав. Кузнецова ад 24 жніўня г. г., ясна ўстанаўляюць, што ўпадабняючы КУЧ і совецкая частка праўлення КУЧ зрабілі ўсё магчымае для забеспячэння бязпечнасці руху на КУЧ і ў прыватнасці, на яе Усходняй лініі. Асобныя, падчас гераічныя намаганні пакладзілі ў гэтым пашаному совецкія служачыя на КУЧ. Рад крушэнняў, у тым ліку японскіх вайсковых паязнёў, былі прадухілены імённа совецкімі служачымі, якія двойнічалі часам з рызыкай для жыцця.

У той-жа час манчжурскія ўлады не толькі не выконвалі дагаворных абавязацельстваў, якія на іх ляжалі па ахове дарогі, але сістэматычна скарачалі яе, асабліва за апошні год, а з 19 мая г. г. зусім знялі ахову з товарных паязнёў Усходняй лініі КУЧ. Не дзіва, што ў разультаце такога становішча, імённа за апошнія месяцы адбылося адзначанае ў нашай ноце ўзмацненне нападаў на Усходнюю лінію КУЧ. Зусім натуральна, што зніжэнне бязпечнасці да катастрафічных межаў прывяло паступова да амаль поўнага параліча і той рух, які аставаўся на Усходняй лініі пасля многіх мерапрыемстваў мытных і іншых улад, надзвычай затруднёных грузавы і нават пасажырскі рух на гэтым важным і маючым міжнароднае значэнне участку.

3. Далей, у ноце ад 4 верасня змяшчаецца сцвярджэнне, быццам японскае ваеннае міністэрства ніколі не выпускала таго камюніке па поваду крушэнняў на КУЧ, на якое я спасылаюся ў маёй ноце ад 22 жніўня.

Тым часам у бюлетэні тэлеграфнага агэнцтва «Сімбун рэнго» ад 18 жніўня змяшчаецца паведамленне агэнцтва, што ў гэты дзень «ваеннае міністэрства выпусціла камюніке, якое пералічае 13 выпадкаў чыгуначных беспарадкаў, якія адбыліся на Усходняй лініі КУЧ паміж красавіком і ліпенем гэтага года». У гэтым-жа камюніке, згодна сцвярджэння агэнцтва, змяшчаецца сцвярджэнне, што «загады аб інцыдэнтах выпускаліся совецкай далёка-ўсходняй арміяй і праводзіліся органамі, складзенымі з совецкіх служачых КУЧ, якія кіравалі бандыцкімі сіламі».

Я не хачу не выказаць здзіўлення, што гэта, згодна вашай заявы, непрыхільна прыпісанае агэнцтвам «Сімбун рэнго» японскаму ваеннаму міністэрству варожа-паклёпніцкае камюніке, накіраванае супроць дзяржавы, з якой Японія знаходзіцца ў нармальных дыпламатычных адносінах, не было да гэтага часу ні кім абвергнута. Між іншым, пытанне аб тым ад каго зыходзіць указанае камюніке агэнцтва «Сімбун рэнго» страціла сваё ранейшае значэнне пасля таго, як Вы самі палічылі магчымым паўтарыць у ноце выступленьня ў гэтым камюніке абвінавачанні супроць совецкіх служачых на КУЧ.

4. Нарэшце, адкідаючы ўсякую адказнасць японскага ўрада за частыя выпадкі пуску пад адкос японскіх вайсковых паязнёў.

Такім-жа чынам абстаіць справа і з другім сцвярджэннем, аб тым, быццам пры крушэннях паязнёў на Усходняй лініі страдалі галоўным чынам японцы і манчжуры і толькі вельмі рэдка—совецкія грамадзяне.

Згодна тых-жа афіцыяльных даных, у часе 22 меўшых месца за апошнія 8 месяцаў на Усходняй лініі КУЧ крушэнняў, а таксама пры нападзенні хунхузаў на чыгуначныя станцыі Усходняй лініі, усяго былі ранены 2 японскіх салдаты, а з ліку совецкіх грамадзян—служачых КУЧ было забіта 9, ранена 171, уведзена хунхузамі ў палон 43 і аграблена 13.

Такім чынам, афіцыяльныя даныя поўнасцю абвяргаюць сцвярджэнні японскага боку і тым самым пацвярджаюць бесперыпынасць і незаконнасць арыштаў грамадзян СССР.

2. Апублікаваныя ў розныя часы афіцыяльныя дакументы КУЧ і, у прыватнасці, заяўленне намесніка старшыні праўлення КУЧ тав. Кузнецова ад 24 жніўня г. г., ясна ўстанаўляюць, што ўпадабняючы КУЧ і совецкая частка праўлення КУЧ зрабілі ўсё магчымае для забеспячэння бязпечнасці руху на КУЧ і ў прыватнасці, на яе Усходняй лініі. Асобныя, падчас гераічныя намаганні пакладзілі ў гэтым пашаному совецкія служачыя на КУЧ. Рад крушэн

Калгаснікі выбіраюць насенне з насенных гуркоў.

АДЛЕЖКА ІЛЬНУ ПАСЛЯ СУШКІ І МЯЦЦЯ ПАВЫШАЕ ЯКАСЦЬ ВАЛАКНА НА 2-3 НУМАРЫ

ІГНАРАВАННЕ ПАСТАНОВЫ ЦК АБ ВЫЛУЧЭННІ НЕ МЕНШ 50 ПРОЦ. КАЛГАСНІКАЎ НА ІЛЬНОАПРАЦОЎКУ—ПРЫЧЫНА ПРАРЫВА У ІЛЬНОЗАГАТОЎКАХ

ЛЁС АДНОЙ ПОШТА-ТЭЛЕГРАМЫ

ШКЛОЎ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

ЦК КП(б)Б папярэдзіў партыйна-совецкае кіраўніцтва Шклоўскага раёна, што калі яно не дабіецца зруху ў ільнозагатоўках, ЦК будзе ў наступную пяцідзённку сушыць аб далейшай яго рабоце. Пяцідзённка прайшла. Але зруху амаль няма. Прырост дасягае ўсяго 2 проц. План выкананы толькі на 21 проц. Ручная пераапрацоўка не разгорнута, асабліва па аднаасобнаму сектару.

Што-ж робіць кіраўніцтва раёна? Сакратар райкома т. Штак, старшыня РВК т. Казінкоў, загатчык канторы Заготлён т. Бохан пішуць... пошта-тэлеграму. Яна друкуецца ў газеце 3 кастрычніка, праз 6 дзён пасля папярэджання, зробленага ЦК партыі. У пошта-тэлеграме крыўда на старшынь сельсоветаў, калгасаў, партарганізатараў: «Даныя дырэктывы аб сканчэнні загатовак ільносемя к 15 верасня, ільнотрасты к 20 верасня і аб арганізацыі апрацоўкі і здачы ільнавалакна дзяржаве не выконваюцца». Далей ідзе пералік сельсоветаў, перадавых і адстаючых. У заключэнне—«РК КП(б)Б, і РВК і Заготлён лічаць неабходным, прапануюць мабілізаваць... узмацніць... закончыць...»

Што-ж робяць на месцах, атрымаўшы тэлеграму, складзеную па прынцыпу: «усім, усім».

Калгас «Прамень комунізма» (Гарадзецкі сельсавет) павінен здаць 20 цэнтн. валакна, здана ўсяго... 50 кгр. У калгасе дзве мялкі. Адна з іх паламана. Ніхто не збіраецца яе рамонтаваць. Другая таксама без работы. Працуюць на ёй раз у пяць дзён. На трапанне выходзяць 2-3 жанчыны ў брыгадзе.

Старшыня калгаса Гелахаў скача на кані па калгасу, але нічога не бачыць. Калгас у цэнтры сельсавета. Старшыня Цітоў ходзіць па вуліцы з партфелем, часамі гаворыць са старшынёй. Але да брыгады, звяна, асобнага калгасніка і калгасніцы кіраўнікі сельсавета і калгаса не апускаюцца. А раённае кіраўніцтва бачыць палі і мяльна-сушыльныя пункты на ходу, з акна аўтамабіля.

Не першую пошта-тэлеграму напісалі тт. Шпак, Казінкаў і Бохан. Але толку мала. Як-бы ні былі суровы дзеясловы «мабілізаваць», «узмацніць», «закончыць», але яны астаюцца пустым гукам, калі не падмацаваны практычнай, арганізацыйнай і масавай работай.

А. М.

ІЛЬНЯНЫЯ ПРАЦАДНІ НЕ УЛІЧВАЮЦЦА

ДУБРОЎНА. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Калгас імя Блюхера, Сватажыцкага сельсавета, з года ў год зрывае ручную апрацоўку ільну і здачу яго дзяржаве. Калгас абслугоўваецца Дуброўенскай МСТ.

У гэтым годзе кіраўніцтва МТС рашыла вывесці калгас з прарыву па ільнаапрацоўцы. Тут меркавалі арганізаваць сушыльна-мяльны пункт. Для гэтага былі ўсе ўмовы. Калгас мае дастатковую колькасць сушыльняў, 12 ручных мялак і інш. МТС абяцала перакінуць у гэты калгас шасціпарвальную мялку і дапамагчы ў пабудове ільнатрапалкі Гарачова.

Аднак, гэта рашэнне асталося толькі на паперы. Да гэтага часу сушыльна-мяльны пункт у калгасе не арганізаваны, 6 сушылень нішчэ не адрамантаваны, зусім не загатоўлены дровы. У двух сушыльнях нават няма печак. Такое-ж становішча і з мялкамі. Усе 12 мялак стаяць паламанымі і палова з іх амаль зусім непрыгодна для работы. Шасціпарвальная мялка для калгаса не адпушчана. А між тым, калгас імя Блюхера — адзін з буйнейшых у раёне і павінен апрацаваць вялікую колькасць ільну.

Як вынік, ручная апрацоўка ільну ў калгасе зрываецца. Калгас прыступіў да апрацоўкі ільну зусім неадрамантаванымі мялкамі, сушыць лён у неадпраўных сушылнях.

Пастанова бюро ПК аб пераключэнні 50 проц. рабочай сілы на лён у раёне ігнаруецца. У калгасе «Перамога», Мардашэвіцкага сельсавета, з 112 калгаснік на ўборцы бульбы працуе 57, астатнія зусім не выходзяць на работу. У калгасе «Чырвоны чырвонец», Кляноўскага сельсавета, з 40 жанчын на апрацоўку ільну пастаўлены толькі 4 жанчыны.

У апошнія дні работы сіла ў большасці калгасаў звята з ільну. Спынілі ільнаапрацоўку калгасы Баеўскага, Тухінскага, Сватажыцкага, Слатаўскага, Клаўсўскага і іншых сельсоветаў.

Рэзультаты такой работы відавочны. Вось ужо трэцяя пяцідзённка, як прырост па здачы ільнавалакна па раёну складае толькі па 0,2-0,3 проц.

А. ЛОСЬ.

НЕ ВЕДАЮЦЬ НІ НОРМ, НІ РАСЦЭНАК

ВІЦЕБСК. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

З першага погляду работа на мяльна-сушыльным пункце другой брыгады калгаса імя 1-га мая ідзе добра. Паглядзеўшы на грэбны трапальшчык і калгаснікаў, абслугоўваючых двухвальную чыгунную мялку, мімаволі падумаеш: «гэтыя людзі ніжэй 12 і 14 нумара валакно не дадуць».

На самой-жа справе апрацаванае валакно без памылкі можна вызначыць 10 нумарам (меншая колькасць) і большасць 8 і 6 нумарам.

У чым справа? Чаму ўдарная праца калгаснікаў дае такі нізкі рэзультат?

Ларчык адкрываецца троста. Сушыльня ацяпляецца яловымі і сасновымі дровамі, з-за чаго траста пакрываецца копаццю, валакно траціць сваю эластычнасць і колер. Траста проста з сушыльні ў гарачым выглядзе ідзе на мялку, і тут-жа з пад мялкі без усякай адлежкі пускаецца на трапанне.

Зразумела, што каб гэтай трасце даць неабходную адлежку як пасля сушкі, так і асабліва пасля мяцця, то нумарнасць валакна ў значнай меры павялічылася-б.

Калгаснікі, апрацаўшыя лён, тут вінаваты менш за ўсё. Аб правільнай апрацоўцы ільну ім ніхто не гаварыў, таксама як ніхто не давёў да іх ні норм выпрацоўкі, ні расцэнак. Вось ужо 5 дзён як яны працуюць і не ведаюць, колькі валакна яны выпрацавалі і што атрымаюць за сваю працу. Не ведаюць яны таксама, якім нумарам трэба здаць валакно. Адказны па ільну Вайцяховіч Цімафей нават не заглядвае на пункт.

Як Старасельскі сельсавет кіруе пераапрацоўкай ільну відаць з таго, што ні сакратар сельсавета Паўлоўскі, ні статыст Маркаў не ведаюць, якую колькасць валакна і якім нумарам трэба здаць дзяржаве па іх сельсавету.

А. З.

Сталовая завода імя Молатава ўтрымліваецца ва ўзорным парадку. НА ЗДЫМКУ: рабочыя завода за абедам.

ЗАКУПКІ ХЛЕБА

ЗАГОТЗЯРНО У РОЛІ КАНКУРЭНТА

(Ад полацкага карэспандэнта «Звязды»)

— Вы з якога калгаса?

— Наша вёска яшчэ не ўступіла ў калгас.

— А гэты хлеб якога калгаса?

— Не ведаем, мы не ў калгасе, мы падводчыкі.

— А якія калгасы знаходзяцца побач з вашай вёскай?

— Побач з вёскай — калгас «Чырвоны сцяг».

— Значыць, пішы квітанцыю, што калгас «Чырвоны сцяг» прадае Заготзярно 4 тоны хлеба.

— Як гэта так? Мы ж толькі падводчыкі, вязем хлеб ад сельпо на склад.

— Бярыце грошы і едзьце. — такі адказ атрымалі падводчыкі ад загатчыка склада Заготзярно Шаўрукова.

Загатчык склада мае інструкцыю, падпісаную загатчыкам полацкай базы Заготзярно Пацёмкіным, што ўвесь прывезены хлеб ад калгасаў запісваць, як куплены Заготзярно.

Для Пацёмкіна няважна, што за гэты хлеб сельпо ўжо заплаціла калгасам. Раз яму дана заданне закупляць хлеб, то ён можа купляць нават закуплены хлеб.

Мы прывялі размову Шаўрукова з падводчыкамі з Замшынскага сельсавета. А такіх размоў штодня можна пачуць на складзе Заготзярно.

2 кастрычніка калгаснікі з калгаса імя Варашылава прывезлі адну тону зярна. У 6 гадзін раніцы падводы прыбылі на склад Заготзярно. Да 12 гадзін яны прастаялі, чакаючы, пакуль прыдзе загатчык склада Шаўрукоў. Але прыняць хлеб Шаўрукоў атмовіўся, бо калгаснікі не пажадалі два разы прадаць адзін і той-жа хлеб.

25 верасня вароніцкае сельпо пакіравала 2,5 тоны хлеба на склад Заготзярно. Калі хлеб быў прывезен на склад, работнікі Заготзярно стараліся ўгаварыць калгаснікаў, каб яны згадзіліся прадаць гэты хлеб Заготзярно. Калгаснікі не згадзіліся. Убачыўшы, што нічога не выходзіць, работнік склада Кліманскі пашоў на афёру. Ён загадаў ссыпаць хлеб у склад, а ў квітку ўказаў, што хлеб закупіла Заготзярно.

Пакуль Заготзярно і райсаюз спрачаюцца, спекулянты тут-жа, каля склада, купляюць хлеб і потым яго перапрадаюць на рынку.

Аб гэтых фактах ведае РК КП(б)Б, але чамусці ніякіх мер не прымае.

5 кастрычніка на нечарговым пасяджэнні бюро Пацёмкін быў папярэджан аб неабходнасці закупляць хлеб у калгасах па месцы. Пасяджэнне скончылася ў 12 гадзін дня. У першай гадзіне дня на склад Заготзярно прыбылі 2 тоны хлеба, закупленага Боярскім сельпо.. Колькі падводчыкі ні пераконвалі Кліманскага і Шаўрукова, што яны ўжо атрымалі грошы за гэты хлеб, ім была выпісана квітанцыя і паўторна выданы грошы. Ажыятаж памж райсаюзам і Заготзярно прадаўжаецца.

Вось чаму за апошні час Полацкі раён, які ў пачатку паказаў нізкіх прыкладаў ў закупцы хлеба, пачаў адставаць.

Н. НЕЙДЛІН.

КАЛГАС НАБЫВАЕ АУТАМАБІЛЬ

БРАГІН. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Калгаснікі буйнейшага ў раёне калгаса «Чырвоны Окцябр» прадалі дзяржаве 72 тоны хлеба. Калгас рашыў купіць грузавы аўтамабіль. Атрымана паведамленне з Белкаапсаюза, што калгасу запараджана паўтаратонка, якая будзе на днях адгружана.

ЮБІЛЕЙ „НАШАГА СЕЛЬКОРА"

У канцылярыі Кабанаўскага сельсавета, Жлобінскага раёна, вісіць чарговы нумар насценгазеты. Яе аператыўныя заметкі, пісаныя рукамі селькораў, клічуць на барацьбу за якасць уборкі, за хутчэйшае правядзенне хлебапаставак.

Вось перадавы артыкул:

«Святкаванне нашага дзесяцігадовага юбілея супадае з усебеларускім з'ездам рабселькораў. Селькоры Кабанаўскага сельсавета павінны сваім актыўным удзелам ва ўсіх правадзімых партыяй і ўрадам кампаніях заваяваць права на атрыманне мандата на ўсебеларускі з'езд рабселькораў. Каб прыняць удзел у з'ездзе, трэба без страт убраць ураджай, своечасова разлічыцца з дзяржавай, у тэрмін скончыць азімую сяўбу...»

Побач з гэтым артыкулам невялічкая заметка старшыні калгаса імя МОПР'а тав. Тарасава.

«Я, старшыня калгаса Імя Мопра, бяру на сябе абавязацельства арганізаваць работу ў калгасе так, каб заняць па ўсіх паказальніках перадавое месца. Я правёў гутаркі сярод аднаасобнікаў, у рэзультаце чаго ў наш калгас уступілі тры аднаасобнікі, у калгас «Прагрэс»—15».

А яшчэ ніжэй у насценгазеце выступаюць два яе старэйшыя селькоры тт. Лапіцкі і Кавалёў.

«Учора мы пашлі на поле да аднаасобніка Я Вострыкава. Растлумачылі яму выгоднасць калгаса. Выступаў нас Вострыкаў а потым на другі дзень уступіў у калгас. Таварышы калгаснікі! Не адгараджвайцеся ад аднаасобнікаў, а растлумачвайце ім выгаднасць калгасаў, арганізуйце прыплыў у калгасы».

Гэта мы прывялі з апошніх нумароў газеты, якая дзесяць год назад была органам «Кружка молодежи». Яе імя — **«Наш селькор».** 15 верасня 1924 года — дата нараджэння газеты. 15 верасня 1934 года — яе дзесяцігодзе.

***

На дзесяцігадовы юбілей «Нашого селькора» прыйшлі прадстаўнікі партарганізацыі, сабраўся актыў калгаснікаў, члены сельсавета, селькоры. Яны ўспамінаюць мінулае сваёй газеты, калі яе першыя нумары былі сарваны рукой класавага ворага. Газета з першых сваіх нумараў выступіла супроць Аўсянікавых, Дамброўскіх, Лавецкіх — кулакоў, асеўшых у вёсцы. Яны пачалі праследаваць селькораў. Кулакам не па густу было нечаканае з'яўленне ў вёсцы небяспечнай «лістоўкі».

Першыя нумары насценгазеты «кабанаўскага гуртка моладзі» канфіскуюць, або, як выражалася ў той час сельсоветская начальства, **«забіраюць у раён».** Тлумачэнне простае: гэта, маў, не газета, а «лістоўка», якая **«размазана, напісана няграматна і бессэнсоўна».** Так пісаў у бабруйскую акругоную газету «Комуніст» сакратар Кабанаўскага сельсавета **Згурскі.**

Рэдактара насценгазеты арыштавалі, запялі ў раённую міліцыю зчалі допыт і пасадзілі. А газету проста сарвалі. Адбылося гэта ў 1924 г. у глушы кабанаўскіх палёскаў, у Стрэшыне, дзе класаварожыя сілы пачалі арганізаванае выступленне супроць селькораў.

Партыя і совецкая ўлада жорстка ўдарылі па ворагах селькораў. Справай зацікавіліся «Правда», «Звязда», «Крестьянская газета». У Менску адбыўся паказальны працэс. **Суд прыгаварыў старшыню сельсавета Аўсянікава да 10 год зняволення, старшыню стрэшынскага РВК Дамброўскага да трох год і начальніка раённай міліцыі Лавецкага да аднаго года зняволення.**

***

Прайшло 10 год. Змяніліся метады работы насценгазеты. Пад штодзённым партыйным кіраўніцтвам узрасла палітычная завостранасць газеты і яе селькораў, мацнее яе непарыўная сувязь з масамі. Ад агітацыі «за выпіску газеты, без якой няма свету», «Наш селькор» узнімаецца да пастаноўкі складанейшых пытанняў калгаснага будаўніцтва.

Першы нумар газеты «Наш селькор».

Сёння партыйная арганізацыя, актыў сельсавета, комсамольцы, селькоры, калгаснікі і нават пошчуючыя на сход працоўныя аднаасобнікі падагульваюць вынікі работы.

— Некалькі год назад па ініцыятыве насценгазеты было створана ў сельсавеце меліяцыйнае таварыства, асушаны дзесяткі гектараў балота.

— У Кабанаўку з менскай соўпартшколы прыехалі ў 1925 годзе комуністы **Русанаў і Гутман.** Яны навучылі рэдкалегію выпускаць аператыўную газету, застрой выкрываць класавага ворага.

Мінуў год, другі. 1 ў трэцюю гадавіну «Нашага селькора» былая акруговая бабруйская газета «Комуніст» загаварыла ўжо аб масавай рабоце насценгазеты.

«15 верасня 1924 г. ў насценгазету пісалі ўсяго 2 селькоры, з красавіка ў газеце было ужо 18 селькораў і 2 селькоркі, у 1925 г. —27 насценкораў, сярод якіх **4 жанчыны,** у 1926 г — 40 селькораў, з іх 4 жанчыны, а ў лістападзе 1927 г. у газету пішна ўжо звыш 60 селькораў. Селькоры насценгазеты—актыўныя ўдзельнікі розных кампаній: збор сродкаў у карысць МОПР'а, у фонд «Наш адказ Чэмберлену». Яны распаўсюджваюць «Сялянскую пазыку» і пазыку індустрыялізацыі.

***

У Кабанаўскім сельсавеце арганізуюцца партыйная ячэйка, ячэйка комсамола. Больш аператыўна пачынае працаваць і сельсоветская насценгазета. Газеце дапамагаюць члены партыі, бю кіруюць, яна расце палітычна. 1 ў 1929 годзе селькоры — актыўныя ўдзельнікі насценгазеты першымі ўзнімаюць пытанне і дабіваюцца арганізацыі на былых кабанаўскіх хутарах калгаса «Комуніст».

Пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі газета ўжо навучылася лепш распазнаваць замаскаванага класавага ворага. **З рэдкалегіі вычышчан кулак Нікіфар Гальмак і па ініцыятыве насценгазеты знімаецца з работы і аддаецца пад суд старшыня сельсавета, школьнік М. Тарасаў.**

Газета выкрывае класавага ворага І. Агеенка, які краў калгасны хлеб. Факты, указаныя газетай, пацвярджаюцца. Агеенка панёс адпаведнае пакаранне.

Разам з насценгазетай пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі растуць і селькоры.

Селькор **М. Далгачоў** на малатарнях камітэта ўзаемадапамогі арганізуе кругласуточную малацьбу не толькі ў калгасах, але і ў гумнах працоўных аднаасобнікаў. **5 малатарань** пушчаны ў ход. Селькор П. Кавалёў — член сельсавета — першым разлічваецца з дзяржавай па хлебапастаўках. За ім следуе яго дзесяцідворка.

Караткевіч, брыгадзір свінаводчай фермы калгаса **«Чырвоная зара»,** учвгвае ў работу сельсавецкай насценгазеты ўсіх калгаснік-свінарак.

1 зусім нядаўна, у дні падрыхтоўкі да свайго дзесяцігадовага юбілея, рэдкалегія насценгазеты дабіваецца ўступлення 15-ці гаспадарак аднаасобнікаў у калгас. Селькор **Кавалёў** ідзе на поле, гутарыць з аднаасобнікам **Войстрыкавым** і апошні пазаўтра падае заяву ў калгас. Селькор **Карпушэнка** абавязваўся «ўзяцца за сіласаванне». І сёння ўжо **«адна яма засіласавана, напаўняецца зялёнай масай другая яма».**

Насценгазета «Наш селькор» аб'яўляе мітынг-перакліку лепшых майстроў калгаснай вытворчасці.

1, нарэшце, «Наш селькор» завязвае міжнародную сувязь з рабочымі-эсперантыстамі Японіі і атрымлівае ад іх пісьмо для калгаснікаў Кабанаўскага сельсавета.

***

«У чырвоным кутку невялікі столік, пакрыты абрусам. Столік завален камплектамі газет, асобнымі экземплярамі. Камплектаў пяць: «Звязда», «Совецкая Беларусь», «Беларуская вёска», «Новая деревня» і бабруйскі «Комуніст».

Спыткі, выразкі, даведкі.

«Рэдакцыйны партфель» насценнай газеты «Наш селькор», якую рэдагуе Гр. Лапіцкі, прадастаўлены цэлай пачкай рукапісаў на кавалачках паперы, пісаных у большасці алоўкам. Почарк усюды каравы, сялянскі — ад сахі. Гэта ўсё — сялянскія карэспандэнцыі ў насценгазеце».

Так дзевяць год назад—13 лютага 1925 г. — пісала «Звязда», адзначаючы нараджэнне адной з першых насценгазет на Бабруйшчыне.

Прайшло 10 год. Дзякуючы штодзённай увазе партыйнай арганізацыі сельсавета, «Наш селькор» вырас у масавую сельсавецкую насценгазету. Ад інфармацыйных заметак, перадрукаваных з цэнтральных газет сельсавецкая насценгазета ўзнімаецца да пастаноўкі важнейшых пытанняў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў. Газета становіцца актыўным памочнікам партыйнай арганізацыі ў яе барацьбе за выкананне гаспадарча-палітычных задач.

Сёння «Нашаму селькору» 10 год.

А. МАТУСЕВІЧ.

ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ VII УСЕСАЮЗНАГА І XI УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДАЎ СОВЕТАЎ

КОЖНЫ ДЭПУТАТ— УДАРНІК НА ВЫТВОРЧАСЦІ

Дэпутацкая група Гомсельмаша налічвае 13 дэпутатаў. Апрача дэпутатаў на заводзе працуюць 87 секцыянераў горсовета. У цэнтры работы нашай дэпутацкай групы сумесна з секцыянерамі стаялі пытанні вытворчага характару. Ва ўсіх цэхах пры кожнай машыне пастаўлен кантрольны пост дэпутацкай групы. Аб усіх недахопах у брыгадзе, цэху гэты кантрольны пост сігналізуе заводскім арганізацыям.

Быў час, калі ліцейны цэх не выконваў заказаў кавальскага цэха на адліўку рэвальверных печак. Аб гэтым данеслі дэпутацкай групе. Яна арганізавала сустрэчу дэпутатаў ліцейшчыкаў і кавалёў, адзін другому прадэманстравалі соцыялістычны рахунак, па-дзелавому абмеркавалі прычыны, з-за якіх зрывалася адліўка печэй, і праз пару дзён заказ быў выкананы.

Дэпутацкая група прымае актыўны ўдзел у пафскай рабоце заводскіх арганізацый. Па нашай ініцыятыве створаны дэпутацкія групы ў калгасах «Шлях да соцыялізма» і «1 мая». Да кожнай з іх мы прымацавалі члена нашай дэпутацкай групы. Час-ад-часу мы правядзілі сустрэчы нашых дэпутатаў з членамі падшэфных сельсоветаў.

У нашай рабоце ёсць яшчэ нямала недахопаў. Разгортваючы падрыхтоўчую работу да перавыбараў советаў, уключыўшыся ў вытворчы паход імя VII з'езда советаў, мы пастараемся навярстаць упушчанае.

Аб нашай сувязі з горсоветам. Горсовет нам зусім не кіруе. Прэзідыум горсовета яшчэ ні разу нас не заслухаў, не праверыў нашай работы.

ЧОРНЫ.

Кіраўнік дэпутацкай групы Гомсельмаша.

У БАРАЦЬБЕ ЗА КУЛЬТУРНЫ БЫТ КАЛГАСНАЙ ВЁСКІ

Уключыўшыся ў вытворчы паход імя VII з'езда советаў, Бытчанскі сельсавет паставіў перад сабой тры асноўныя задачы:

1. Пасяхова правесці ўсе гаспадарча-палітычныя кампаніі.

2. Арганізаваць масавы прыліў працоўных аднаасобнікаў у калгасы.

3. Змагацца за культурны быт калгасніка, працоўнага аднаасобніка.

На аснове шырокага соцыялістычнага спаборніцтва паміж калгаснікамі сельсавет дабіўся за кароткі тэрмін буйных поспехаў. Закончана ўборка бульбы і бульба-паставкі дзяржаве; перавыкананы план зяблівага ворыва і сіласавання; засыпаны насенныя і страхавыя фонды да пасеўнай 1935 года як у калгасах, так і ў аднаасобным сектары; ва ўсіх жывёлагадоўчых фермах створаны кармавыя фонды, забяспечваючыя калгаснай жывёле сытую зімоўку.

К 15 кастрычніка закончым здачу дзяржаве ільнавалакна, а к 20 кастрычніка ўсе сельска-гаспадарчыя работы і рамонтаванне дахоў.

Вельмі добра праходзіць культпаход. Гэту работу ўзначаліла наша комсамольская ячэйка і члены сельсавета. Стварылі 5 культбрыгад, якія ўжо абследавалі 300 сялянскіх хат.

У рэзультаце гэтай работы за кароткі час пабелена і ачышчана 30 хат.

У калгасе «Большэвік» (в. М-Стахаў) высыпалі плоскон нуйцу, правялі ў хаты электрычнасць, ачысцілі ўсе двары ад гразі.

Вось першыя рэзультаты паходу. Паход пашыраецца, у яго ўключаюцца новыя дзесяткі і сотні людзей.

Н. РОЯК.

Старшыня Бытчанскага сельсавета, Барысаўшчына.

БССР да XVII гадавіны Окцябра

СЯМ'Я ГАУРЫЛЕНКІ

КОЛА ЖЫЦЦЯ ПАДНОСЧЫКА ШПАЛ

Трыццаць пяць год падносіў шпалы на чыгунцы Іван Гаўрыленка. У паложаны час адбыў у салдаты. У паложаны час ажаніўся ў хаце яго пяць сыноў: Іван, Васіль, Павел, Лявон, Аляксандр. І памёр Іван Гаўрыленка вартаўніком каля чыгуначнага маста, скончыўшы аднатоннае кола свайго жыцця. А кола жыцця павярнулася і закружылася абаротам для другога пакалення.

Не паспелі на поўаршына падняцца ад зямлі сыны, як кола іх жыцця зрабіла першы рух. Старэйшыя і малодшыя паступілі на фанерны завод Каплана насіць фанеру. А сярэдні Павел пашоў па бацькаўскаму шляху — на чыгунцы насіць шпалы. Было яму 11 год. І тут суседзі прарочылі: у дваццаць адзін пойдзе ў салдаты, у дваццаць пяць ажэніцца, у дваццаць шэсць будзе першы сын, у сорак памрэ.

11-гадоваму Паўлу асталося толькі выконваць гэты перспектыўны план на сорак год. Дзяржава ўзаконьвае гэты план, выдаўшы хлапчуку пасведчанне «крестьянина Горвальской волости». Так яго афіцыяльна ўзводзілі на пракляты шлях бяднейшых сялян.

Доўга круціў гэту паперку ў руках стары Іван Гаўрыленка. І пакольку ён выпіў чарку, самыя сакрэтныя яго думкі бесталкова прасіліся на язык. Іван Гаўрыленка моцна стукнуў кулаком па стале.

—Брэшаш,—крыкнуў ён нейкаму невядомаму. — Брэшаш, даволі!.. Я на сваіх плячах столькі шпал перанёс, што не толькі дзецям, але і ўнукам хопіць. Канец, Паўлік у мяне чалавекам будзе.

І пачаў Іван Гаўрыленка навучаць Паўліка, якім шляхам трэба ісці ў жыцці.

— Ты-ж глядзі, не балуй, не лянуйся, старанным будзь з арцельным старастам, ветлівым будзь, розум свой выказвай. Глядзіш, можа гадоў праз дзесяць цябе і прызначаць арцельным старастам. А староста — гэта чалавек...

Старэйшы брат Васіль звычайна смяяўся:

— А мне, бацька, што? Да дырэктара завода імкнуцца? У яго таксама жыццё не салодкае...

— Дурны, маўчы, — крычаў бацька. — Старацца трэба, свой розум мець трэба!

ШЛІ ЗВЫЧАЙНЫЯ РАБОЧЫЯ ДНІ

І пяць сыноў Івана Гаўрыленкі стараліся. Цягалі шпалы, цягалі фанеру, стаялі каля прэсаў, у дыме, у пары, і нічога не дапамагала. Толькі аднойчы на разумнага, старанага маладога падчоснага шпал звярнуў увагу работнік станцыі Казёл.

— Ты, хлапец, здаецца свядомы, — спытаў ён яго за штабелямі шпал. — Можа з цябе тэхнік выйсці. Грамату ведаеш?

— Па літарах, — саромліва адказаў Павел.

— На, прачытай.

Павел угледзеўся ў паперу, вынятую Казлом з кішэні. «РСДРП, — пераразумеючы, пратытаў ён. — Чаго хочуць людзі... як я... ходзяць з чырвонымі сцягамі».

— Ну, ідзі, дома прачытаеш,— пахлопаў па яго плячу Казёл.

Калі Паўлік прачытаў паперу, яму стала страшна ад безлічы нахлынуўшых думак. Так адбылося ў жыцці Паўла першае ступленне ад намечанага суседзямі плана.

А стары маставы вартаўнік Іван Гаўрыленка між тым рашыў пайсці да дарожнага майстра Гумінскага.

— Я наконт сына — сказаў ён нясмела, здымаючы шапку ў сенцах.—Каб яму на старасту...

Дарожны майстар, тоўсты, валасаты, у адной споднай сарочцы сядзеў за сталом.

— Тэк-с! — краклуў ён і абцёр вусы. — На старасту Гэта месца залатое...

Некалькі секунд маўчалі.

— Дык што вы нараіце? — ціха спытаў Іван Гаўрыленка.

— Параіць няма чаго. Залатое месца, кажу. Трэба імкнуцца заняць.

— Залатое, кажаце, — уздыхнуў вартаўнік і памацаў кішэню. Там звінела толькі пагнутая старая медзь. Эх, каб золата хоць-бы дзве дзесяткі!.. Ён павярнуўся і вышаў, не надзяючы шапкі. Так скончылася мара аб казённай хатцы, аб 20 рублях у месяц, аб знаёмстве з высокімі людзьмі.

Хаця не. Высокія людзі хутка без знаёмства паведалі Івана Гаўрыленка. Уночы пастукалі. І калі адчыніў дзверы, стары ды святле запалкі ўбачыў залатыя шнуры і жандарскія наплечнікі.

— Гаўрыленка Павел тут? — грозна запытаў жандар.

Паўла не было, ён хаваўся ў лесе. Жандары абшукалі хату і не знайшлі нічога.

— «Усё адно не прапушчу, — сказаў жандар. — Маіх рук не мінуе».

Павел не стаў арцельным старастам і пашоў у салдаты. Вярнуўся з салдат і ажаніўся. І зноў пачаў падносіць шпалы на чыгунцы год за годам. Урэшце, у Паўла нарадзіўся першы сын Міхась. Кола жыцця павярнулася для трэцяга пакалення. Зараз Паўлу засталося чакаць толькі смерці.

ПРА БЯЛІЗНУ І НАВУКУ

Але Павел не памёр. Памёр сярэдні брат яго Лёўка, захварэўшы сухоты на фанерным заводзе Каплана. Хвароба спаліла яго за некалькі месяцаў. Лёўка ляжаў у старой бацькаўскай хаце і марыў: хаця-б крыху лягчэй працаваць, хаця-б машыну і крыху больнага паветра, я яшчэ-б вытрымаў!..

Ён не вытрымаў, яго пахавалі на могілках каля фанернага завода Каплана.

Павел Гаўрыленка рашыў цвёрда, што сына трэба навучыць грамаце, а потым, калі патрэбуюцца грошы — набыць і ўсё-ж такі зрабіць яго арцельным старастам. І хлопчык бегаў у школу, а маці ішла на дачу, да ўпраўляючага завода Генахава і да прыказара Кантаровіча мыць бялізну. За гэта ў дзень давалі 20 кап. І маці дзівілася, як трэба жыць, як трэба эканоміць? Цэлыя дні працуеш, а есці няма чаго.

Многа бялізны мелі мадам Кантаровіч і мадам Генахава. Балелі рукі, ламіла спіна. Па 9 гадзін, не разгінаючыся, стаяла Вольга Гаўрыленка ў вазе, у халоднай асенняй рэчцы. Мыла, зарабляла сыну на бацінкі, на кніжкі. І ўсё адно босы бегаў у школу сын, і ўсё адно пісаў ён на жоўтай паперы старых чыгуначных квітанцый, знойдзеных бацькам на шпалах.

Вольга мыла бялізну. Каля берага гувернантка хадзіла з дзецьмі ўпраўляючага. Дзеці балаваліся, у руках у іх былі царагія дзіцячыя кніжкі з малюнкамі. Капрызны хлапчук разарваў кніжку і кінуў на бераг. Адзін лісток з малюнкам падляцеў да бялізны. Сэрца Вольгі абліцца крывёю.

— Навукай кідаюцца. Жадныя...

Яна беражна падняла лісток і схавала за пазуху.

ДНІ ЗАБУРЛІЛІ ПА-НОВАМУ

І рантам кола жыцця перавярнулася зусім. Дарожнага майстра Гумінскага забілі, арцельны староста Фралоў і гаспадар фанернага завода Каплан уцяклі. Че на каго стала вучыцца. Наступіла рэволюцыя.

Павел Гаўрыленка перайшоў на завод да большэвікоў. Кола жыцця круцілася з ліхаманкавай хуткасцю. Прышлі немцы і арыштавалі Паўла Гаўрыленка. Прышлі палякі і спалілі завод. Прышлі большэвікі і зноў вызвалілі Паўла. І з таго часу стаў Павел Гаўрыленка працаваць на совецкім цвіковым заводзе «Інтэрнацыянал».

І адбылося ў гэтыя гады яшчэ адно здарэнне. Старшы брат Паўла — Васіль пайшоў з партызанскім атрадам. Недалёка ад Рэчыцы белапольская куля ўдарыла яго ў грудзі. І ён упаў на полі, абліваючы крывёй зямлю. Калі да яго падышлі партызаны, Васіль уздыхнуў:

— Хацеў-бы я ведаць, ці не дарма паміраю, ці будуць тут калі працоўныя сяляне сеяць і збіраць ураджай?..

— Не дарма, — адказалі яму партызаны і закрылі вочы.

Між тым нарадзіўся ў Паўла яшчэ сын Нікалай, дачка Алена і дачка Александра. Старшы сын Міхась скончыў школу і падаў заяву ў інстытут. Яго адразу прынялі. Праз некаторы час падаў заяву другі, прынялі і таго. Калі-ж трэцяя дачка паступіла ў інстытут, а чацвертая пачала сямігодку, калі завод дапамог Паўлу Гаўрыленка атрымаць урэшце, хату, Павел зразумеў, што кола яго жыцця пайшло па-новаму і к смерці не набліжаецца.

Сорак год рабочага жыцця стаялі за плячыма. І ад імя гэтых сарака год Павел Гаўрыленка напісаў:

«Лучэйцы КП(б)Б завода «Інтэрнацыянал».

Прашу прыняць мяне ў рады партыі з прычыны таго, што я не магу больш заставацца беспартыйным».

І стары Павел Гаўрыленка стаў хадзіць у школу, арганізоўваць калгасы, і хутка яго выбралі сакратаром парткалектыва экстрактнага завода імя Раранылага.

КУДЫ ПАВЯРНУЛАСЯ КОЛА ЖЫЦЦЯ

Некалі дзед Іван Гаўрыленка марыў: «калі-б золата хоць дзве дзесяткі!»... Зараз унучка яго, меншая дачка Паўла, комсамолка Александра, скончыўшая геолагаразведачны факультэт Іркуцкага горнага інстытута, працуе ў Алтайскай выведчай партыі трэста «Цветметзолота». Драга набірае пясок і па латках з вадой цячэ гэты незвычайны пясок. Залатыя крупінкі затрымліваюцца каля сеткі. Алеся нагінаецца і бярэ поўныя прыгаршчы гэтага казачнага метала, народнага багацця Совецкай краіны. Золата сыплецца ў яе між пальцаў і яна смяецца.

— Хлопцы, глядзіце, я мільярдэрша!..

Некалі брат Паўла — Лёўка, паміраючы ад сухот, марыў: «калі-б крыху лягчэй працаваць, калі-б машына»... Зараз пляменнік яго, сярэдні сын Паўла, комуніст Нікалай, скончыўшы Ламаносаўскі інстытут, працуе галоўным інжынерам Беразнякоўскага хімкамбіната. Інжынер падыходзіць і правярае лічыльнікі. Шматгрэшная сіла гудзіць у турбінах і тады ён запісвае ў настольны журнал: «Нагрузка 10 тысяч кільват».

Некалі брат Паўла — Васіль, забіты белапольскай куляй, марыў: ці заваюе ён шчасце сялянам на палях. Зараз пляменнік яго, старэйшы сын Паўла — комуніст Міхась, скончыўшы Пятроўска-Разумоўскую сельгасакадэмію, працуе канструктарам на заводзе Гомсельмаш. Складаная машына ільнокамбайн «Гільштайна» ляжыць перад ім у рысунках. Міхась правярае іх яшчэ раз. Здаецца, усе працэсы апрацоўкі ільну ўлічаны, і тады Міхась піша зверху над чарцяжом: «у вытворчасць».

Некалі жонка Паўла — Вольга ніяк не магла зразумець, як-жа гэта эканомна жыць, як весці яшчасную гаспадарку, у якой працуеш, а есці няма чаго. Зараз сярэдняя дачка яе — комсамолка Елена, што канчае Новасібірскі планава-эканамічны інстытут, піша/маці пісьмы пра гэорыю народнай совецкай гаспадаркі, пра вядзенне гаспадаркі цэлых заводаў, планы якіх яна вучыцца складаць.

— Што вы хочаце, каб быць шчаслівай? — спыталі старую матку.

Яна прамаўчала. Шчасце? Ці думала яна калі, ці марыла? Шапка арцельнага старасты з чыгуннай бляхай здавалася ёй ідэалам, а зараз... Беразьнякоўскі хімкамбінат... Гомсельмаш... Яна бачыла гэты вялікі завод, дзе інжынерам яе сын. Шчасце? Што яна хоча?

— Хочацца толькі жыць!

Павел Іванавіч Гаўрыленка, бацька гэтай сям'і, прышоўшы на чыстку партарганізацыі чыгуначнага завода імя Варашылава, заявіў:

— Я не толькі парторг на заводзе, я дома парторг. У мяне два сыны комуністы, дзве дачкі комсамолкі. Буду адказваць за цэлую партгрупу.

Б. ПАСКАНЬЕЎ.

г. Рэчыца. Завод імя Варашылава

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

САКРАТАРУ ЧЫРВОНАСЛАБОДСКАГА РК КП(б)Б тав. БУРДЗІЛАВУ.

НІ УВАГІ, НІ КІРАЎНІЦТВА

(ПІСЬМО ДОКТАРА)

Пасля сканчэння медінстытута ў 1933 годзе я была накіравана НК аховы здароўя ў Чырвоную Слабаду для работы ў якасці загадчыцы дзіцячай кансультацыі.

Прыбыўшы на месца я на працягу 5 месяцаў не мела кватэры.

Кансультацыя і амбулаторыя знаходзяцца ў адным калідорнай пакоі. Побач, у бараку, хворыя. Прыбіральшчыца адна на кансультацыю і на дызентэрыйны барак. На мае патрабаванні прадаставіць кансультацыі лепшае памяшканне загадчык райздрава тав. Герцман адказвае: «Я цябе зусім выкіну з амбулаторыі, бо ты мне надакучыла сваім дзіцячым крыкам».

Наогул у раёне дзіцячыя ўстановы не атрымліваюць ні дапамогі, ні належнага кіраўніцтва.

Нядаўна дом, дзе я жыла, згарэў. Я асталася зноў без прытулку.

Зварачалася некалькі раз у камгас, у РВК і райздрав. Але ўсе безрэзультатна.

ПРУДНІКАВА.

УПАЎНАВАЖАНАМУ НАРКОМСУВЯЗІ ПА БССР т. ВАЛОДЗЬКА

АДРАС ПАДВЁЎ...

(ПІСЬМО ГАБОЧАГА)

4 красавіка гэтага года я паслаў брату ў Гомель пасылку. Пакуль пасылка ішла ў Гомель, брата перавялі на Далёкі Усход.

Даведаўшыся аб гэтым, я падаў заяву ў бюро скаргаў пры менскай паштовай канторы. Скаргу прынялі, абяцаўшы вярнуць пасылку. Пасля гэтага я амаль кожны дзень хадзіў на пошту, хацеў даведацца аб вынніках. І, нарэшце, толькі 20 верасня мне адказалі, што пасылку знішчылі, бо яна доўга ляжала, і рэчы згнілі.

Загадчык архіва паштовай канторы заяўляе: «Адрас падвёў. Вам паслалі позву ў Мінск, а вуліцу ўказалі, па якой ваш брат жыў у Гомелі».

Пасылка мая ацэнена, але плаціць пошта адмовілася.

ГУРЗВІЧ

СТАРШЫНІ МАЗЫРСКАГА РВК тав. ЖОГАВУ

ТАК ШКОЛЫ НЕ ПАБУДУЕШ

(ПІСЬМО ДЗЕСЯТНІКА)

Будаўніцтва азарыцкай яўрэйскай школы (Мазырскі раён) пачалося яшчэ ў 1931 годзе. Будаўнічымі работамі кіруе загадчык комунальнага аддзела РВК т. Дубінскі.

Рабочыя, каб атрымаць паёк і зарплату, прымушаны ездзіць за 50 кілометраў у Мазыр. Бывае, што паёк і зарплата да він. Дубінскага не выдаюцца па 3-4 месяцы. З гэтай прычыны рабочыя пакідаюць работу. Будаўніцтва школы зрываецца.

ШАБЛІНСКІ.

СТАРШЫНІ ГЛУСКАГА РВК тав. ШЛЯХТУНОВУ

БЕСПРЫТУЛЬНЫЯ УСТАНОВЫ

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

У Глускім раёне ніхто не цікавіцца работай дзіцячых устаноў. Загадчык райаддзела аховы здароўя тав. Некрашэвіч, таксама загадчык аддзела Наркомасветы т. Кроль нават не ведаюць, дзе ёсць дзіцячыя сады і дзіцячыя пляцоўкі.

Па загаду старшыні калгаса «Чырвоны маяк» Лугіна закрыт калгасны дзіцячы сад. Глускі дзіцячы сад цэлымі месяцамі бывае закрыт. У памяшканні дзіцячага саду брудна. Медыцынскі агляд дзяцей праводзіцца ўсяго раз у год.

Дрэнна працуе і раённая дзіцячая кансультацыя. Справа дайшла да таго, што наведвальніцы перасталі зварачацца ў кансультацыю.

АЛ. ШПАКОЎСКІ.

НАМ ПІШУЦЬ

* Тав. **В. Дзявочка** піша, што яму 9 жніўня з Дабрынеўскага паштовага аддзялення (Дзяржынскі раён) былі высланы на адрас Заслаўскага аддзялення 25 руб. Прайшло два месяцы, а грошы не атрыманы.

* Тав. **М. Прахарэнка**, піша, што памяшканне Доўгавіцкага медпункта (Мсціслаўскі раён) не адрамантавана, дах працякае. Доўгавіцкі сельсавет не клапоціцца, каб адрамантаваць медпункт і стварыць умовы для работы.

Па слядах пісем

„РАСТРАТЧЫК КІРУЕ СТАЛОВАЙ"

Пад такім загалоўкам 26-га верасня г. г. было змешчана пісьмо **Вінгура** аб тым, што загадчык сталовай Мозырскага партактыва **Гофман**, па-шкодніцку адносіцца да даручанай яму справы, растраціў 1400 руб., груба адносіцца да наведвальнікаў, займаецца самаспажэннем. Ён зволіў з працы работніцу Яўжэнка, якая выкрыла яго злачынствы.

Мазырскі РК КП(б)Б паведамляе, што факты **поўнасцю пацвердзіліся.** Гофман з працы **знят** і справа перадана у суд.

2. Культура

ПІСЬМЫ З ЛЕНІНГРАДА

На беразе Невы раскінуліся карпусы завода—ВТНУ імя Сталіна.

Падыходзім да завода. У памяці адпаўлюцца некаторыя спраўкі, стаўшыя гістарычнымі.

Тут, у гэтых карпусах, нарадзілася першая совецкая турбіна. Тут, у гэтых карпусах, працуе моцны большэвіцкі калектыў, які здолеў у напружанай барацьбе асвоіць складанейшыя турбіны па чарцяжах ангельскай фірмы «Метро Віккерс» і стварыць свае, з сваім матэрыялаў, сваёй канструкцыі арыгінальныя турбіны вялікай магутнасці.

Гэтаму заводу прысвечан фільм «Сустрэчны». Тут нарадзілася песня, якая звініць на ўсяму Саюзу, песня аб нашай сіле, маладосці і радасці, песня аб «сустрэчным».

**

Заходзім на двор. Бадаецца ў вочы надзвычайная чыстата двара і ўбор[illegible]. Оправа, на сцяне — [illegible] вітрына. Здалёку выхліпваюцца [illegible] партрэт кампазітара Пластаноўка [illegible] Ленінградскія кампазітары [illegible] гапаровым месцы. Імёны [illegible] іншых кампазітараў і музыкантаў [illegible] тут настолькі-ж [illegible] і імёны лепшых ударнікаў, [illegible] пулярны, [illegible] нікаў.

Турбінны цэх. І тут тая-ж узорная чыстата. Шумяць варштаты і над'ёмкі, але сярод гэтага шуму самых рознастайных машын, пад імі і ў праходах — ні адной стружкі, ні крупінкі пылу. У цэху няма нічога лішняга. Тут усё на месцы.

Гэта першае ўражанне. Праходзім далей. На сцяне невялікая дошка. З-пад шкла на нас глядзяць Алексей Талстой, Шолахаў, Барыс Лаўрэнёў і інш. А побач— вытрымкі з іх твораў, маленькія спісы што чытаць гэтых аўтараў.

Культура вытворчасці моцна пераплялася з музыкаў, літаратурай, тэатрам. Мастацтва ўвайшло ў быт рабочага, яно стала яго неадлучнай патрэбай, бо гэты велізарны завод выробляе не толькі дасканалыя турбіны, але выхоўвае вытатных інжынераў і тэхнікаў, культурных, новых, соцыялістычных рабочых.

У цэхах мала лозунгаў, але кожны лозунг кароткі, ясны, выразны.

Днём рабочы працуе ў чыстым прасторным цэху. **На заводзе створана спецыяльная брыгада прыбіральшчыкаў.** 30 чалавек на чаале з брыгадзірам сочаць за чысталёй цэхаў. **Прыбіральшчыца бесперапынна падмятае падлогу.** На такую падлогу нічога лішняга не кінеш. Тут трэба пасцыпліноваць сябе, сачыць за сабой.

Партыйная арганізацыя завода, і ў прыватнасці сакратар парткома т. Іванов, паставіла пытанне аб культуры. Было праведзена некалькі калектыўных паходаў у тэатры, кіно, на канцэрты. Лепшыя тэатральныя сілы горада былі запрошаны на завод, дзе рабочыя разам з імі абмяркоўвалі прагледжаныя пастаноўкі.

Узяліся за літаратуру. Бралі цікавейшыя кнігі і абмяркоўвалі іх разам з пісьменнікам. Імкненне да кнігі, да літаратуры вырасла невымерна. За кароткі час заводская бібліятэка вырасла да **35 тыс. кніг.** І гэтай колькасці кніг усё-ж не хапае.

Зараз завод **першым у Саюзе рыхтуецца да заводскай канферэнцыі па выхаванню дзяцей.**

Падрыхтоўка пачалася вельмі проста. На заводзе збіраўся звычайны рабочы сход. Партыйны камітэт запрасіў для ўдзелу ў гэтым сходзе выкладчыкаў падшэфных школ. Яны прыйшлі і расказалі рабочым, як працуюць школы і як вучацца іх дзеці. Рабочыя далі рад указанняў выкладчыкам, разам узяцца за пастаноўку выхавання дзяцей.

Парткам завода пакавяла вялікую работу сярод бацькоў. Ім указвалі, якія кнігі павінны чытаць дзеці. Газета «Сталінец» выпусціла некалькі спецыяльна дзіцячых літаратурных старонак.

Падрыхтоўка да канферэнцыі ахапіла ўвесь завод, прычым старыя рабочыя і работніцы праяўляюць асаблівую цікавасць да гэтага мерапрыемства, бо справа выхавання дзяцей стала агульнарабочай справай.

У вопыт барацьбы за культуру кожнае прадпрыемства ўнесла сваю долю.

На **«Светлане»** **арганізавана рабочая кансерваторыя.** Здатныя да музыкі рабочыя і работніцы, пад кіраўніцтвам буйнейшых майстроў мастацтва, павышаюць сваю музычную кваліфікацыю.

Партыйная арганізацыя ўваходзіць ва ўсе дэталі быту рабочых. Моладзь хоча танцаваць. І яна танцуе. Але і танцаваць трэба ўмела, культурна. Партыйная арганізацыя «Светланы» арганізуе спецыяльную **танцавальную залу,** дзе кваліфікаваныя кіраўнікі навучаюць новым танцам і культурна арганізоўваюць гэту справу.

Вялізную работу правяла партыйная арганізацыя завода **«Электросіла»** па ўкараненню культурных навыкаў як у вытворчасць, так і ў быт рабочага. Партарганізацыя абвясціла паход па добрабыту кватэр рабочых і самога завода. Сіламі комуністаў і перадавога беспартыйнага актыва праверылі да **1.000** рабочых кватэр, прычым праверылі не толькі кватэры, але і клеці, пагрэбы, кухні, іх санітарна-гігіенічны стан.

Нямалая работа была праведзена з **жонкамі** рабочых. У парадку падрыхтоўкі да заводскай канферэнцыі была склікана спецыяльная канферэнцыя жонак рабочых. У канферэнцыі прымала ўдзел 450 жанчын. К прыходу ўдзельнікаў канферэнцыі на завод ім была арганізавана ўрачыстая сустрэча. Удзельнікам канферэнцыі паказалі цэхі, паказалі, дзе працуюць іх мужы, паказалі ўзорную пастаноўку культуры на самім заводзе. Спецыяльную работу і правёў завод у жаўтах.

І рэзультаты сказаліся. Зараз кватэры рабочых завода знаходзяцца ва ўзорным парадку.

На заводзе **«Красный путиловец»** вялікая ўвага аддаецца культурнай рабоце ў бараку. У кожным бараку арганізован культурны совет, які апартураваў вакол сябе актыў.

Культурны совет з дапамогай актыва арганізуе культурна-масавую работу. У асобных бараках арганізаваны драмгурткі, струнныя аркестры, на спартпляцоўцы праводзяцца гульні і т. д.

Работніцы барака № 591 арганізавалі спецыяльную майстэрню **па чыстцы і ўцюжцы вопраткі.**

Як дасягнулі партыйныя арганізацыі Ленінграда такіх вялікіх госпехаў у палапшэнні стану рабочых кватэр і арганізацыі культурна-масавай работы? Такіх рэзультатаў можна было дабіцца толькі пры ўвазе да гэтай справы ўсіх партыйных работнікаў і партыйнага актыва прадпрыемстваў. Пачынаючы ад **сакратара парткома і канчаючы цэхавым партыйным арганізатарам кожны з іх ведае, дзе жыве работы данага цэха, у якім стане знаходзіцца яго кватэра і т. д.**

Культура ўваходзіць у цэх, у самую вытворчасць. Жывець і верасень прадпрыемствы былі заняты падрыхтоўкай да IV квартала. Чацверты квартал — рашаючы ў **выкананні гадавога задання.** На чацверты квартал задание амаль па ўсіх прадпрыемствах павышанае. І партыйныя арганізацыі не чакалі, пакуль наступіць чацверты квартал і нанесце пагроза невыканання плана. Мабілізацыя рабочага калектыва, ліквідацыя ўсіх недахопаў у рабоце былі праведзены да пачатку IV квартала, і 1 кастрычніка прадпрыемствы сустрэлі падрыхтаванымі.

Ленінградскія прадпрыемствы даўно ўжо не ведаюць штурмаў па ліквідацыі прарываў. Асноўная ўстаноўка — **працаваць роўнамерна, без рывкоў.**

Зараз завод **«Севкабель»** праводзіць падрыхтоўку да **дня найвышэйшых паказальнікаў.** Вывучаецца работа кожнага варштата і кожнага рабочага. У варштаце выяўляюцца ўсе недахопы. Рамантуюцца зношаныя часткі. Знішчаюцца ўсе недахопы ў дастаўцы матэрыяла. Завод рыхтуецца да такога дня, калі ён зможа даць вышэйшыя паказальнікі па выкананню плана і па якасці прадукцыі.

З гэтым мерапрыемствам непарыўна звязана барацьба за дасягнанне гусценных нарматыкаў. Завод **«Севкабель»** — гэта прадпрыемства вялікай дакладнасці. Ён выробляе пачынаючы ад тоўстых кабелей да дроту, таўшчынёю ў тры сотых міліметра. Гэты дрот пакрываецца невялікім пластом гумы. Але асобныя работнікі заводу шчодрыя. Замест устаноўленых норм яны даюць значна больш гумы. Гэтага ніхто не патрабуе — ні тэхнічная норма, ні спажывец. А захаванне сусветных нарматываў можа даць прадпрыемству надзвычай вялікую эканомію, скароціць выдаткаванне сыравіны і палепшыць якасць. Усяўвага накіравана на гэтыя сусветныя нарматывы, на дасягненне вялікай дакладнасці і акуратнасці.

Да рэчы, аб акуратнасці. Калі ідзеш па цэхах «Севкабеля», успамінаюцца цэхі беларускіх некаторых прадпрыемстваў. Гэтай акуратнасці ў нас яшчэ няма. Сцены цэхаў светла афарбаваны. І на гэтых сценах выдзяляюцца чырвоныя чырвоныя простакутнікі. На простакутніках вісяць агнетушыцелі і пажарныя рукавы. Гэта іх месца. У выпадку патрэбы іх можна знайсці адразу. Яны выдзяляюцца здалёку. Але і на другім месцы ім вісець забаронена.

На «Севкабеле», на заводзе імя Сталіна, на «Скороходе» на сценах цэхаў — невялічкія дошчаткі. Надпіс: **«Насілкі».** Стрэлка паказвае, што насілкі знаходзяцца ў гэтым месцы. Іх шукаць не трэба. Гэта невялічкая, але вельмі важная дэталь.

На фабрыцы **«Скороход»** усе варштаты пакрыты светлай фарбай. Яны вельмі чыстыя. Чыстыя цэхі, чыстыя варштаты, акуратныя рабочыя...

Большэвікі Ленінграда ўнеслі ў гісторыю сваёй барацьбы яшчэ адну слаўную перамогу. Яны дабіліся вялікіх дасягненняў у барацьбе за культуру: культуру ў быце, вытворчасці, ва ўсім жыцці.

Я. ГЛЕЗЕР.

ІСПАНІЯ У АГНІ РЭВОЛЮЦЫЙНЫХ БАЕЎ

РЭВОЛЮЦЫЙНЫ РУХ АХАПІЎ УСЮ ІСПАНІЮ

ЛОНДАН, 9 кастрычніка. (БЕЛТА). Спецкор **«Дэйлі уоркер»**, які прабраўся ў Барселону, паведамляе:

«Сёння раніцой рэвалюцыйныя сілы ў Каталоніі значна ўмацаваліся, наколькі значная частка анархістаў далучылася да арганізацыі адзінага фронта — «альянса обрэра». Капітуляцыя незалежнага каталонскага ўрада часткова выклікана тым, што многія анархісцкія лідэры прадаўжалі прытрымлівацца свайго старадаўняга саюза з Ларусам. Яны адмовіліся далучыцца да «альянса обрэра» для барацьбы за незалежнасць Каталоніі. Не падлягае сумненню, што за мінуўшую ноч значная частка анархістаў парвала з гэтай палітыкай і зараз б'ецца побач з «альянса обрэра». У якой меры гэта азначае афіцыяльную перамену пазіцыі ўсяго анархісцкага кіраўніцтва — яшчэ не ясна».

Карэспандэнт **«Морнінг пост»** указвае, што ва ўсіх правінцыяльных цэнтрах прадаўжаюцца хваляванні, стрэльба і крывапраліцце. Карэспандэнт **«Дэйлі экспрэс»** адкрыта заяўляе, што **стачачная барацьба абвастраецца па ўсёй Іспаніі.** Карэспандэнт прыводзіць у якасці прыкладу Севілью, дзе спынена нават работа ваданправода, электрычнай і газавай станцый. Нават карэспандэнт **«Таймс»**, які падтрымлівае асабліва цесныя ўзаемаадносіны з іспанскімі ўрадавымі коламі, заяўляе, што становішча ў краіне стала «зацяжным». Карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф» указвае, што ў Мадрыдзе вялікая трывога ў сувязі з пашырэннем рэвалюцыйнага руху таксама і на Паўднёвую Іспанію. У сувязі з гэтым — гаворыць далей карэспандэнт, — паведамляюць, што ў Грэнадзе да ўсеагульнай стачкі далучыліся транспартнікі, будаўнікі, металісты і ткачы. Урадавыя будынкі ахоўваюцца кавалерыйскімі і артылерыйскімі атрадамі. Усеагульная стачка аб'яўлена таксама па ўсёй правінцыі Карунья (Галісія).

Мадрыдскі карэспандэнт «Дэйлі мэйль» паведамляе з аўтарытэтных крыніц, што ўрад намеран неадкладна затрэбаваць у картэсаў паўнамоцтваў на змяшэнне шляхам дэкрэта існуючага выбарчага закона, скасаваць дэпутацкую недатыкальнасць, аднавіць кару смерцю і правесці муніцыпальныя выбары на працягу 5 месяцаў і парламенцкія выбары на працягу 12 месяцаў. Карэспандэнт указвае далей, што ўрад аддасць усіх, хто быў арыштован са зброяй у руках ваенным судам, якія, несумненна, вынесуць ім смяротныя прыгавары.

Вялікае значэнне надаецца рашэнню ўрада аб'явіць мабілізацыю чыгуначнікаў і іншых тэхнічных сіл. Згодна паведамлення карэспандэнта «Дэйлі тэлеграф», ноччу чакалася мабілізацыя першага і другога разрадаў армейскага запасу, г. зн. асоб маладзей 40 год. Мадрыдскі карэспандэнт «Ньюс кронікл» паведамляе, што ён бачыў дзяўчат, якія раздавалі салдатам лістоўкі на вуліцах. Карэспандэнту ўдалося атрымаць адзін экземпляр такой лістоўкі. У ёй змяшчаецца заклік да салдатаў **не страляць у сваіх братоў па класу, а аднацца з пролетарыятам для барацьбы супроць фашызма.**

Агенцтва «Брытыш юнайтэд прэс» паведамляе, што ў Астурыі паўстанцы захапілі арсенал і прыступілі к абстрэлу Овіедо з цяжкіх гармат. Услед за тым арсенал падвергся абстрэлу з боку ўрадавых бомбавозаў.

ЧАКАЮЦЦА САМЫЯ ЖОРСТКІЯ БАІ

ЛОНДАН, 9 кастрычніка (БЕЛта). Паведамляюць, што ў Овіедо — «галоўнай цвярдыні паўстанняў» — чакаецца самы жорсткі бой за ўвесь час усеагульнай стачкі. Над горадам лятаюць самалёты, якія скідаюць бомбы. Тры артылерыйскія ўзводы і два палкі замежнага легіёна ідуць на Овіедо.

Паўстанцы захапілі горад Саберо, у Більбао губернатар затрэбаваў вайсковых падмацаванняў. У Малазе аб'яўлена ўсеагульная стачка. У Астурыі паўстанцы вядуць арганізаваную барацьбу, а ў «чырвоных прыгарадах» Мадрыда адбываюцца буйныя партызанскія сутычкі. Мадрыдскім банкам сёння дана распараджэнне раней спыніць заняткі, бо ўлады не могуць гарантаваць іх ахову.

ПАСЯДЖЭННЕ КАРТЭСАЎ

ПАРЫЖ, 10 кастрычніка (БЕЛта). Як паведамляюць з Мадрыда, адбылося пасяджэнне картэсаў (парламент). Сацыялістычная фракцыя не была прадстаўлена. Лідэр «Аксіон популяр» Роблес прапанаваў спыніць пасяджэнні картэсаў аж да «нармалізацыі становішча» і выказаць давер'е ўраду **Леруса.** Прапанова была прынята.

З Барселоны паведамляюць аб арышце б. прэм'ера Асанья, узначаліўшага ў пачатку стачкі незалежны ўрад у Каталоніі.

УЗМАЦНІЦЬ ПРОЛЕТАРСКУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

АДОЗВА ЦК КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 10 кастрычніка. (БЕЛТА). У сувязі з забойствам караля Александра і міністра Барту, ЦК компартыі апублікаваў адозву да працоўных, у якой гаворыцца, што ў капіталістычным свеце, узброеным да зубоў, адно тэрарыстычнае забойства следуе за другім.

«Праз некалькі тыдняў пасля забойства Дольфуса ў Вене,—гаворыцца ў адозве,—у Марселі забіт югаслаўскі кароль Александр і французскі міністр замежных спраў Барту. Сараеўскае забойства ў 1914 годзе напамінае ўсім народам, што індывідуальны тэрор—гэта любімая зброя імперыялістаў у мэтах правакацыі вайны... З другога боку,—гаворыцца адозве,—фашысцкія сілы, якія свабодна ўзбройваюцца ва Францыі, прабуюць скарыстаць кожны інцыдэнт і адбыўшыеся ў Марселі забойствы для распальвання грамадзянскай вайны.

«Учора вечарам,—паведамляе Цэнтральны Камітэт КПФ.—фашысцкія арганізацыі «Круа дэ фэ», «Камло дэю руа», «Жэнес патрыёт» і францісты прабавалі весці ў Парыжы правакацыйную агітацыю». Цэнтральны Камітэт напамінае працоўным, што яны павінны быць пільны, як ніколі і гатовы абараняць свае класавыя арганізацыі супроць фашысцкіх замахаў. Перад тварам сур'ёзных падзей, якія адбыліся ўчора, Цэнтральны Камітэт заклікае працоўныя масы ўзмацніць адзінства дзеянняў для барацьбы за мір і свабоду».

БІЯГРАФІЯ ЛУІ БАРТУ

Памёршы міністр замежных спраў Францыі ЛУІ БАРТУ радзіўся 25 жніўня 1862 года ў ОЛАРОН (дэпартамент Ніжнія Пірынеі). Барту скончыў юрыдычны факультэт і займаўся журналістыкай. У 1889 годзе ён упершыню быў выбран у палату дэпутатаў. У 1894 годзе ўпершыню ўступіў ва ўрад, заняўшы пост міністра грамадскіх работ. У наступныя гады неаднаразова ўваходзіў ва ўрад у якасці міністра ўнутраных спраў, міністра грамадскіх работ, міністра пошты і тэлеграфа і міністра юстыцыі.

У 1913 годзе Барту ўзначаліў першыню габінет. У часе сусветнай вайны ўваходзіў па пістапад 1917 года ў габінет ПЕНЛЕВЕ ў якасці міністра замежных спраў. Пасля сусветнай вайны ўдзельнічаў у якасці ваеннага міністра ў габінеце БРЫЯНА і ў якасці міністра юстыцыі ў габінеце ПУАНКАРЭ.

З 1922 года па 1926 год Барту быў старшынёй рэпарацыйнай камісіі. У 1926 годзе зноў увайшоў у якасці міністра юстыцыі ў габінет Пуанкарэ і захаваў гэты пост і пры наступных урадах да 1929 года. У 1930-1931 гг. займаў пост ваеннага міністра.

У апошнія гады Барту быў сенатарам і належаў да групы «радыкальны і дэмакратычны саюз».

Пасля лютаўскіх дзён пры стварэнні ўрада «нацыянальнага яднання» Барту ўступіў ва ўзросце 72 год у габінет ДУМЕРГА, заняўшы ў ім пост міністра замежных спраў.

Барту быў віднейшым палітычным дзеячом у сучаснай Францыі і карыстаўся буйнейшым аўтарытэтам на міжнароднай палітычнай арэне. Барту быў членам Французскай акадэміі навук. (БЕЛТА).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ТРАУР ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 10 кастрычніка (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што французкі габінет пастанавіў абвясціць нацыянальны траур для арміі, флота і авіяцыі тэрмінам на месяц. Барту будзе наладжана нацыянальнае пахаванне. Пры выхадзе з міністэрства Эрыо заявіў: «Зараз нават нельга сабе ўявіць усёй трагічнасці становішча».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ ЗАБОЙСТВА ЮГАСЛАЎСКАГА КАРАЛЯ

ХТО ЗАБОЙЦА?

ПАРЫЖ, 10 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляе Гавас, у забойцы Югаслаўскага караля і міністра Барту быў знойдзен пашпарт, выданы нібы 30 мая 1934 года чэхаславацкім консульствам у Загрэбе. У пашпарце ўказваецца, што Кепемен — купец, радзіўся ў 1899 годзе ў Загрэбе і пражывае ў Празе. Ва Францыю ён прыбыў 28 верасня бягучага года.

Паводле паведзеных у Загрэбе вестак высветлілася, што чэхаславацкае консульства не выдавала 30 мая пашпарта на імя Келемена, а французскае консульства не выдавала яму візы на ўезд ва Францыю. Такім чынам пашпарт і віза Келемена, як ідаць, падробленыя.

ВЕНА, 10 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Белграда, забойца караля Александра і міністра Барту Пётр Келемен — загрэбскі жыхар, член харвацкай нацыяналістычнай партыі, ставіўшы сабе мэтай шляхам тэрарыстычных актаў падрыхтоўваць узброенае паўстанне для адколу Харватыі ад Югаславіі.

ЮГАСЛАЎСКІМ КАРАЛЁМ АБВЕШЧАН 11-ГАДОВЫ ПРЫНЦ

ПАРЫЖ, 10 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляе Гавас з Белграда, совет міністраў абвясціў югаслаўскім каралём 11-гадовага сына забітага караля Александра—наследніка прэстола Пятра, які вучыцца зараз у Англіі ў Каледжы, і назначыў пры ім двух рэгентаў: сербскага і харвацкага. Адначасова паведамляюць, што мяркуецца абвясціць у Югаславіі «становішча трывогі».

ПАРЫЖ, 10 кастрычніка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе з Марселя падрабязнасці забойства караля Александра і міністра замежных спраў Барту.

У 16 гадзін 10 мін. (19 гадзін 10 мін. па маскоўскаму часу), калі каралеўская працэсія прыбліжалася да плошчы біржы, невядомы, прарваўшыся праз шпалеры паліцыі, застрэліў паліцэйскага, прабаваўшага затрымаць яго, ускочыў на падножку аўтамабіля, у якім ехаў кароль, і выпусціў у яго 5 стрэлаў. 2 папалі ў печань 1 грудзі, пасля чаго кароль у хуткім часе памёр.

Акружаўшыя пакінуліся на забойцу, нанеслі яму некалькі шабельных удараў, звалілі з ног, але ён прадаўжаў страляць і, лежачы, яшчэ выпусціў 7 стрэлаў з аўтаматычнага пісталета (як паведамляюць, забойца быў узброен двума рэвальверамі навейшай сістэмы і меў бомбу ў кішэні). Пасля гэтага ён прабаваў пакончыць сабою, але быў застрелен паліцыяй.

Стрэламі забойцы быў ранен таксама Барту, начальнік французскай ваеннай місіі генерал Жорж, два паліцэйскіх і некалькі старонніх чалавек.

У Барту была прабіта косць шыйнага пазванка. Рана гэта здавалася безапаснай для жыцця, аднак у часе аперацыі адбылося крывяцячэнне. Пераліванне крыві не дапамагло. Барту памёр у 17 гадзін 40 мінут.

Генерал Жорж у цяжкім становішчы знаходзіцца ў больніцы. Паведамленне аб яго смерці не пацвярджаецца.

„ЗАБОЙСТВА ІНСПІРЫ РАВАНА ГЕРМАНІЯЙ"

СТАКГОЛЬМ. 10 кастрычніка. (БЕЛТА). Забойствы ў Марселі зрабілі патрасаючае ўражанне на скандынаўскую грамадскасць. Увесь шведскі друк бачыць у замаху матывы, прадыктаваныя міжнароднай палітыкай і пакіраваныя на зрыў палітыкі міру. На думку ўрадавай «Соцыялдэмократэн», той факт, што забойства Александра адбылося ў часе наведання ім Францыі і што забіт таксама Барту, пацвярджае, што ў злачынстве ўдзельнічалі германафільскія колы Югаславіі. У карэспандэнцыі з Парыжа кансерватыўная «Свенска дагбладэт» паведамляе, што ў Парыжы выказваецца дапушчэнне, што забойствы былі інспірыраваны Германіяй.

АРЫШТ БРАТА ЗАБОЙЦЫ

ПАРЫЖ, 10 кастрычніка. (БЕЛТА). Гавас паведамляе з Белграда, што там арыштован брат забойцы караля Александра—дантыст-хірург Келемен, уражэнец Загрэба.

ПРАГА Ў ЖАЛОБЕ

ПРАГА, 10 кастрычніка. (БЕЛТА). Паведамленне аб забойствах у Марселі выклікала ў Празе найвялікшае патрасенне. У знак жалобы неадклална былі спынены ўсе тэатральныя прадстаўленні і радыёперадача. На урадавых будынках падняты жалобныя оцягі. Совет міністраў аб'явіў у краіне нацыянальную жалобу.

ПА САЮЗУ І СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

* * *

ПРЫЁМ ПАСЛА ЗША тав. МОЛАТАВЫМ

9 кастрычніка старшыня СНК Саюза ССР тав. **В. М. Молатаў** прыняў пасла Злучаных Штатаў Амерыкі п. **В. Х. Булліта.**

(БЕЛТА).

ПАДАРУНКІ БІРАБІДЖАНСКАМУ З'ЕЗДУ СОВЕТАЎ

У снежні ў Біраблджане адбудзецца першы абласны з'езд советаў.

9 кастрычніка прэзідыум Бел. Азета заслухаў даклады прадстаўнікоў з месц аб ходзе падрыхтоўкі да з'езда советаў падшэфнага Біраблджана.

На віцебскай фабрыцы «Профінтэрн» па ініцыятыве рабочага 4-га цэха тав. Кагана вырабляецца для падшэфнага сельсовета ст. Ландока 10 коўдраў. Менскі горсовет рыхтуе абсталяванне для вакзала горада Біраблджана: радыё, бібліятэку, а таксама сігналізацыю, шкло для стралак і электрычныя правады. Будаўнічы трэст выдзяліў розных інструментаў на 5 тыс. руб. Шчотачная фабрыка пасылае 250 шчотак для чысткі коней.

Калгаснікі, рабочыя соўтаса, прамысловых арцелей і вучні школ Піраўвіцкага сельсовета, Жлобінскага раёна, уключыліся ў шэфскую работу і сабралі на падарункі 1.400 руб.

Цэнтральны совет профсаюзаў накіруе дэлегатамі на з'езд 10 ударнікаў тых прадпрыемстваў і калгасаў, якія дадуць лепшыя вытворчыя паказальнікі і дзе ўзорна пастаўлена інтэрнацыянальна-масавая і агітацыйная работа.

550.000 ПАР АБУТКУ

Абутковыя фабрыкі ў Беларусі пашыраюць сваю вытворчасць. У чацвертым квартале яны дадуць 550.000 пар абутку супроць 432.600 пар у трэцім квартале.

Значна павялічваецца выпуск дзіцячага абутку. Будзе выпушчана 135.000 пар абутку для школьнікаў і 90.000 пар для дзяцей дашкольнага ўзросту.

ПАБУДУЕМ АГІТЗВЯНО САМАЛЁТАЎ ІМЯ ТРЭЦЯГА З'ЕЗДА РАБСЕЛЬКОРАЎ

⊙ Рабкоры цэха склада сыравіны скурзавода «Большэвік» падрыхтоўваюць ініцыятыву барысаўскіх фабрычна-заводскіх газет аб пабудове звяна самалётаў імя III усебеларускага з'езда рабселькораў.

Рэдактар штодзённі Люблінерман унёс на пабудову самалёта 3 руб. і выклікаў наследваць яго прыкладу астатніх рабкораў цэха: 30 рабкораў і рабочых цэха склада ўнеслі 75 руб. і выклікалі на спаборніцтва першы хромавы цэх завода.

⊙ Калектыў супрацоўнікаў рэдакцыі газеты **«Раўдонасіс артоянс»** у адказ на выклік групы супрацоўнікаў газеты «Звязда» ўносіць на пабудову агітзвяна самалётаў імя III з'езда рабселькораў 100 рублёў і выклікае рэдакцыі наступных раённых газет: «Большэвік Мсціслаўшчыны» (Мсціслаў), «Калгасны сцяг» (Чавусы), «За соцыялістычнае будаўніцтва» (Дуброўна), «Комуністычны шлях» (Крупкі), «Ленінскі сцяг» (Лёзна), «Калгасная праўда» (Лепель), «Ленінскі шлях» (Слуцк), «Прымежны калгаснік» (Ушачы).

НАСУСТРАЧ ХУІІ ГАДАВІНЕ ОКЦЯБРА

◆ Заводскі камітэт шклозавода імя Домбаля ў Барысаве да свята радыёфікуе 42 кватэры старых кадравых рабочых.

◆ Гомельская машына-трактарная майстэрня заканчвае будаўніцтва новага дома на 4 кватэры і інтэрната для рамонтных рабочых.

У РАДАХ ПЕРАДАВЫХ

Белтранспромсаюз выканаў промфінплан трэцяга квартала 1934 года на **100,5 проц.**

Промфінплан за 9 месяцаў 1934 года па сістэме выканан на 113,4 проц. У параўнанні з 9 месяцамі 1933 года ёсць рост на 172,9 проц.

Старшыня прэзідыума Белтранспромсаюза АЎРУЦІН.

У ІНСТЫТУТАХ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

* * *

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

Гісторыя Беларусі — асноўная праблема, над якой працуе Інстытут гісторыі БелАН. Зараз акад. Пічарбакоў падрыхтоўвае другую частку «Нарысаў гісторыі Беларусі».

Пачынаецца падрыхтоўка да друку матэрыялаў для зборніка «Рабочы рух на Беларусі ў перыяд 1861-1917 г.».

Інстытут разгарнуў работу па складанню «Гісторыі Беларусі ў дакументах» у 2-х тамах. Хрэстаматыя разлічана на студэнцтва, як вучэбны матэрыял для семінарскіх заняткаў і для выкладчыкаў ВНУ і поўных сярэдніх школ. У канцы 1934 г. інстытут мяркуе падрыхтаваць да друку першы том размерам у 25—30 друкаваных аркушаў.

Вядзецца папярэдняя работа па тэме «Гісторыя БССР». Ужо собран матэрыял па калгаснаму руху і класавай барацьбе ў БССР.

У ліпені і жніўні 1934 г. праведзена экспедыцыя па абследаванню палеалітычных стаянак на тэрыторыі Беларусі, гарадзішчаў і могільнікаў эпохі разлажэння родавага грамадства і ўзнікнення феадалізма. Раскопкі і абследаванне далі рад каштоўных матэрыялаў для работы: «Нарысы па гісторыі дакласавага грамадства ў Беларусі», рыхтуемай да друку секцыяй археалогіі.

За першае паўгоддзе ў інстытуце прачытаны наступныя навуковыя даклады: «Індаеўрапеістыка на службе фашызма», «Распад панскай гаспадаркі на Беларусі ў пачатку XIX ст.», «Ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай і задачы гісторыкаў-марксістаў». «1863 год у Літве». Заслухана таксама дысертацыя на тэму «Совецка-польская вайна 1919-20 гг».

Вучоны сакратар Інстытута БАГДАНАЎ.

ПІСЬМО АКАДЭМІКА І. П. ПАЎЛАВА

У адказ на пасланае прывітанне, прэзідыум БелАН атрымаў ад акадэміка І. П. Паўлава пісьмо наступнага зместу:

«Вялікае дзякуй членам Беларускай акадэміі Навук за прывітанне і добрыя пажаданні да дня майго 85-годдзя.

Акадэмік ІВ. ПАЎЛАЎ».



Калгас «Чырвоная зорка», Менскага раёна, вядзе малочна-гародную гаспадарку.

Малочныя прадукты калгас па дагавору з кааперацыяй снабжае рабочых млына імя Дзяржынскага і рабочых кавалізацыі.

Зараз у калгасе 37 дойных кароў. Стада расце за лік свайго маладняка: пялят да аднаго года ў калгасе налічваецца 31 галава. Апрача таго калгас на ільготных умовах мінулай зімой набыў печыў кожную калгасную сям'ю маладняком рагатай жывёлы. НА ЗДЫМКУ: калгасніе стада на пасбішчы.

Музыка

ПАДЗЕЯ ВЯЛІКАЙ МАСТАЦКАЙ ВАЖНАСЦІ

(Да адкрыцця сімфанічнага сезона).

Арганізацыя радыёкамітэтам вялікага сімфанічнага аркестра з 65 чалавек, з поўным складам інструментаў, не выключаючы і арфы, з'яўляецца падзеяй вялікай важнасці ў культурным жыцці Менска і ўсёй Беларусі. Такі аркестр, безумоўна, з'явіцца адным з сур'ёзных фактараў узняцця музычнай культуры працоўных мас.

Трэба адзначыць, як не менш важны факт, запрашэнне для кіраўніцтва гэтым аркестрам выдатнейшых дырыжэраў з Масквы, Ленінграда і іншых буйных цэнтраў нашага Саюза. Працоўныя БССР у бягучым сезоне змогуць азнаёміцца непасрэдна ў канцэртных залах і праз радыё з лепшымі творамі музычнай літаратуры ў мастацкай трактоўцы такіх майстроў-дырыжэраў, як Італійскі-Іванаў, Орлоў, Гапаевы і інш.

Праграма першага канцэрта, які адбыўся гэтымі днямі ў зале Дома партактыва, вызначалася сваёй мастацкасцю і рознастайнасцю, чым вытрымаецца ў падборы твораў. Яна прадстаўляла сумесь твораў розных эпох і народнасцей. Цэнтральнымі кумарамі праграмы былі «Шэхерэзада» Рымскага-Карсакова і «Прэлюдыі» Ліста.

Запрошаны для адкрыцця сезона народны артыст рэспублікі Л. П. Штэйнберг правёў праграму з улюбёным яму мастацкім майстэрствам прадумана, без залішніх афектацый.

Трэба аддаць справядлівасць і аркестру, які з гонарам справіўся з праграмай як з тэхнічнага, так і з мастацкага боку. Прыгожы менуэт Бакерыні, тонка выкананы аркестрам, выклікаў вялікае ўзбуджэнне і, па патрабаванню слухачоў, быў паўторан.

Для нас, кампазітараў БССР, існаванне вялікага кваліфікаванага сімфанічнага аркестра з'яўляецца натхняючым стымулам для стварэння буйных сімфанічных твораў, якія даўгуль не выносіліся на суд грамадскасці з-за адсутнасці падобнага калектыва.

Кампазітары Н. АЛАДАЎ, С. ПАЛОЧКІ, М. РАВЕНСКІ, Т. ШНІТМАН.

АУТАЛІНІЯ РАГАЧОЎ—БАБРУЙСК

Беларжэлтранс адкрыў новую аўтабусную лінію Рагачоў—Бабруйск. Пасажырскія аўтабусы курсіруюць штодзённа. (БЕЛТА).

ПАПРАЎКІ

У інструкцыі аб выбарах у советы БССР, якая змешчана ва ўчарашнім нумары «Звязды», па віне карэктуры ўкралася памылка. Другі абзац п. 56 трэба чытаць: **«Выбаршыя камісіі і іх упаўнаважаныя не маюць права высоўваць ад сябе і прапанаваць выбаршчыкам ні асобных кандыдатаў, ні асобных спісаў».**

***

Чацверты абзац другой калонкі тэлеграмы аб падзеях у Іспаніі «Рэвалюцыйны рух ахапіў усю краіну», якая змешчана таксама ва ўчарашнім нумары, трэба чытаць: «У радзе раёнаў пачаліся рэвалюцыйныя сялянскія выступленні, якія суправаджаюцца расправай з рэакцыянерамі і царкоўнікамі. У вёсках сялянне паляць царквы».

ПРАГРАМА РАДЫЁПЕРАДАЧ

(ПРАЗ МЕНСКУЮ РАДЫЁСТАНЦЫЮ ІМЯ СНК БССР).

НА 11 КАСТРЫЧНІКА

10.15. Перадача для дзяцей: журнал «Дашкольнік». 16.15. Канцэрт. 17.20. Перадача для дзяцей. **18.00.** Радыёп'еса на польскай мове. **19.15.** Канцэрт. 19.45. Заўтрашняя піянучоба. 20.45. Літаратурная перадача: «Чырвонаармейскі аддзячынак». 21.30. Перадача групы дакладаў і выступленняў: «З чым сустракаем зіму». 22.00. Канцэрт. 23.00. Літаратурная перадача на ўйрэйскай мове.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Культпроп ЦК КП(б)Б склікае сёння ў 12 г. дня, у пакоі 99 (5 паверх) нараду, на якую абавязкова павінны з'явіцца наступныя таварышы: Лозбень, Фрэйдман (НДІ комвыхавання), Баран, Ліўкова, Дзімітраў, Кушнерэў (Гістпарт), Галавач і Лынькоў (школьнікі), Якубчык, Сокалаў, Лісейчыкаў, Лейбовіч (БелАН), Юрашкевіч, Башкевіч.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

Першы Дзяржаўны тэатр (БДТ—1) — СЁННЯ КАНЕЦ ДРУЖБЫ. Пачатак у 8 гадзін веч.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" — Гук-ры мастацкі фільм ПЕЦЕРБУРГСКАЯ НОЧ. У фойэ—канцэрт аркестра

Кіно-тэатр „Пролетарый" — Мастацкі фільм НАТЭЛЛА. У фойэ—канцэрт муз-джаза

Кіно „Інтэрнацыянал" — Совецкі мастацкі фільм „ВЯЛІКАЕ ГОРА МАЛЕНЬКАЙ ЖАНЧЫНЫ"

Кіно „СПАРТАК" — НОВЫ УСХОДНІ ФІЛЬМ МЗАГО І ГЕЛЛА. драма ў 6 частках.

АЯОНСІ СКОРАІ ПЫШКА. МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПА АПАВЯДАННЮ ГЮІ дэ-МОПАСАНА. Рэжыс. М. І. РООМ. Аператар Б. ВАЛЧОК.

На падставе пастановы Соўнаркома БССР ад 30-IX—34 г. і загада наркамата мясцовай прамысловасці за № 23 ад 4-X—34 г.,

Беларускі культурна-прамысловы трэст „Белкультпромтрэст" б. наркамата лёгкай прамысловасці

ліквідуецца

з 5 кастрычніка.

Усе ўстановы і асобы, маючыя правы ці да ўказанага трэста, павінны прад'явіць іх на працягу двухтыднёвага тэрміну з дня апублікавання гэтай аб'явы, пасля чаго ніякія прэтэнзіі разглядацца не будуць.

Ліквідком.

Інстытут совецкага будаўніцтва і права Беларускай Акадэміі Навук

Паведамляе, што 14 кастрычніка ў 7 гадз. адбудзецца пасяджэнне Інстытута (ўваход з Ленінскай, пакой 29), на якім т. РУДЗІЦКІ зробіць даклад на тэму: „Сельсоветы на новым этапе". Уваход вольны.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ЦЫРКАВОЕ ЭСТРАДНАЕ БЮРО

Наркомасветы БССР даводзіць да ведама ўсіх культаддзелаў саюзаў, загадчыкаў клубамі, фабзаўкомаў і інш. зацікаўленых арганізацый, што з 15 кастрычніка ЦЭБ'ам прымаюцца заяўкі на мастацкае абслугоўванне артыстычнымі сіламі Окцябрскіх свят.

Для мастацкага абслугоўвання окцябрскіх свят спецыяльна запрашаюцца артысты вышэйшай кваліфікацыі як БССР, так і іншых рэспублік наступных жанраў: юмар, сатыра, скетчы, ансамблі, цырк, балет, інструменталісты і інш.

Прыём заяваў штодзённа з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дня ў памяшканні ЦЭБ, клуб Совкінслужачых (рог Энгельса і Комуністычнай, пакой № 8, тел. 22-755).

ЦЭБ.

Нарсуд 4 аўч. гор. Менска абвяшчае грамадзяніна ганьбаванне КУЛЕЙВІЧУ К. А. згодна прыгавора суда ад 6-7—34 г. па 107 арт. КК.

Нарсуд 4 аўч. гор. Менска абвяшчае грамадзяніна ганьбаванне ПОЙКО А. З. згодна прыгавора суда ад 6-7—1934 г. па 107 арт. КК.

МЕНСК

ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМА ЛКСМБ.

9 кастрычніка ў зале клуба імя VII з'езда прафсаюзаў адбыўся пашыраны пленум Менскага гаркома ЛКСМБ па пытанню аб ушчыльненні рабочага дня.

Пленум заслухаў даклады дырэктара завода «Комунар» тав. Драбышэўскага, завода «Большэвік» тав. Бандарчыка і імя Молатава тав. Карасіка, а таксама сакратароў камітэтаў комсамола гэтых прадпрыемстваў.

У спрэчках з вялікай прамовай аб задачах ушчыльнення рабочага дня, выканання промфінплана і паляпшэння матэрыяльна-бытавога становішча рабочых і рабочай моладзі выступілі сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Аўгустайціс, нам. сакратара Менгаркома КП(б)Б тав. Хадасевіч і сакратар Менгаркома ЛКСМБ тав. Галкоўскі.

Пленум намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па ўшчыльненню рабочага дня на менскіх прадпрыемствах.

* * *

★ ДА ЗІМОВАГА СЕЗОНА рыхтуецца стадыён вышэйшага совета фізкультуры. Ужо загатоўлена 1.200 пар лыж.

★ УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА МЕХАНІКАЎ, ГАРМОЎЧЫКАЎ МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ МАЙСТЭРАНЬ І СТАРШЫНЬ РАБАЧКОМАЎ МТС адкрылася ўчора. У рабоце нарады прымае ўдзел звыш 100 чалавек. Нарада прысвечана пытанням арганізацыі працы і заработнай платы ў часе рамонтнай кампаніі.

У батанічным садзе Акадэміі навук выгадоўваюцца розныя народы дэкаратыўных раслін з мэтай вызначэння найбольш прыгодных для заселянення гарадоў.

ПРЫЕЗД У МЕНСК АЎСТРЫЙСКАГА МАЭСТРО ГАНСА КМОХА.

«Інтурыст» атрымаў паведамленне аб тым, што 16 кастрычніка праездам у Вену ў Менску спыніцца аўстрыйскі маэстро Ганс Кмох. У той жа дзень маэстро дасць сеанс адначасовай ігры ў шахматы. 17 кастрычніка адбудзецца агульна-гарадскі шахматны турнір з удзелам Кмоха.

ГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РАБОТНІЦ І ЖОНАК РАБОЧЫХ.

Учора ў Доме партактыва адбылася гарадская канферэнцыя работніц і жонак рабочых Менска.

Лепшыя ўдарніцы прадпрыемстваў, актывісткі—жонкі рабочых перадавых жахтаў абмеркавалі пытанне аб падрыхтоўцы да зімы.

Пасля даклада нам. старшыні горсовета тав. Шулькіна разгарнуліся спрэчкі.

Усяго выказалася 12 чалавек. Актыўнасць была вельмі вялікая. Канферэнцыя прыняла зварот да ўсіх работніц і жонак рабочых БССР аб перавыбарах советаў і лепшай падрыхтоўцы да зімы.

* * *

★ 85000 РУБ. перадаў на карысць палітэміграваных капіталістычных краін ЦК МОПР'а Беларусі. Гэтыя грошы выручаны ад здачы ўраджаю з 2.244 мопраўскіх гектараў.

★ ПАДРЫХТОЎКА ДА СТРАЛКОВЫХ СПАБОРНІЦТВАЎ пачалася на 10 прадпрыемствах і ў навучальных установах. Напярэдадні окцябрскіх свят паміж камандамі адбудуцца таварыскія сустрэчы на першынства стралковага калектыва горада.

★ ПАВОДЛЕ ВЕСТАК БЮРО НАДЗОР'Я, у Менску тэмпература панедзелка ноччу з 10 на 11 кастрычніка—1-4, сёння днём ад 12 да 14 градусаў, без ападкаў. Вятры 2—4 балы, паўднёвых і паўднёва-ўсходніх напрамкаў.

Менск, друкарня «Звязды» Выпускаючы—А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж—Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпар—ПЕДЗІК, ст. друкар—АНУЧЫН. Уп. Галаўлітбела № 262.